Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гада.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 50 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародзяе	— 20 к.
мясцовым	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашпаралі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нашпаралі пасярод тэксту 1 р. — к.
За радок нашпаралі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчныя на 50 проц. дарожэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Вестрадоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 258 (2446) Субота, 10-га лістапада 1928 г.

Сьвята ўсяго працоўнага чалавецтва.

Прыгнечаныя і эксплёатуемыя масы капіталістычнага сьвету дэманстравалі ў кастрычніковыя дні сваю салідарнасьць з перамогшым пралетарыятам савецкіх краін.

КАСТРЫЧНІКАВЫЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦІ Ў СССР ПРАЙШЛІ З НЯБЫВАЛЫМ УЗДЫМАМ ВОЛІ ДА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ПЕРАБУДОВЫ КРАЮ ПАД СЬЦЯГАМІ КАМПАРТЫІ.

Чырвоная сталіца ў дні Кастрычніка

Пад знакам поступу наперад да сусьветнага Кастрычніка.

У сьвяточных дэманстрацыях удзельнічала больш паўміліёну чалавек.

МАСКВА, 8-XI. Да 9-ці гадзін раніцы на Чырвоным пляцы пасталі ў шэрагі войскі з аркестрамі і сьцягамі наперадзе. Пляц пекна ўпрыгожаны чырвонымі сьцягамі і плякатамі. За маўзалеем, на Крамлёўскай вежы, разьвейваецца вялізны чырвоны сьцяг з лёзунгам: «Адзінства і згуртаванасьць ленінскае партыі пераможа ўсе цяжкасьці». Над вежай лічба «XI». Па сьцяне, над магіламі герояў Кастрычнікавае рэвалюцыі эмблема серпа і молата і чырвоная зорка. Каля ўваходу на Чырвоны пляц вялізныя плякаты з лёзунгамі: «Наперад, да буйнае калектыўнае гаспадаркі», «Няхай жыве 1917 год», «Чырвоная армія—апора палітыкі міру СССР», «Няхай жыве Кастрычнік».

Трыбуны па абодвых баках маўзалею перапоўнены. Перад маўзалеем члены ЦК УсеКП(б), МК УсеКП(б), члены ўраду, прэзыдыум Камінтэрну, Прафінтэрну, МОПР'у, УЦСПС, МГСПС, таварыства старых бальшавікоў і інш. З правага боку перад маўзалеем—вайсковыя аташэ; на левым крыле правае трыбуны—члены дыпляматычнага корпусу. Парадам камандуе намесьнік камандуючага войскам Маскоўскага Вайсковага Вокругу тав. Куйбышаў.

Роўна а 10 гадзіне раніцы чуецца каманда: «Парад, сьмірна, раўняйся направа». Аркестры граюць «спатканьне», і з брамы Спаскае вежы выходзіць прымаючы парад т. М. І. Калінін, разам з т. Уншліхтам і іншымі членамі Рэвалюцыйнага Вайскёвага Савету. Прыняўшы рапарт ад т. Куйбышава, т. Калінін і т. Уншліхт садзяцца ў аўтамабіль і разам з т. Куйбышавым і камендантам гораду т. Ткалуном абʼяжджаюць шэрагі, віталючы войска. Гучнае «ура» у працягу 15 хвілін чуецца на пляцы і сумежных з ім вуліцах.

Абʼезд скончан. Чуюцца гукі «Інтэрнацыяналу», зле сотні мядзяных труб ня могуць заглушыць захапляючага «ура», якое пясецца з маладых чырвоаармейскіх грудзей. Тав. Калінін узыходзіць на левае крыло маўзалею. Пачынаюцца прывітальныя прамовы. Першым выступае сэкратар маскоўскага камітэту УсеКП(б) т. Угланаў, потым т. Калінін. Прамову т. Калініна пакрываецца «Інтэрнацыяналам» і артылерыйскім салютам.

Тав. Калінін спушчаецца з маўзалею. Пачынаецца ўрачысты праход войск. Наперадзе дэманстрацыі—камандуючы парадам т. Куйбышаў салютуе т. Калініну і далучаецца да групы перад маўзалеем. Тав. Калінін сустракае войска гучнымі прывітаньнямі. Дружным „ура" адгукваюцца шэрагі. За імі ідуць шэрагі чырвоных акадэмікаў, школ, курсаў і інш. вайскова-навучальных устаноў. Удзельнічала ў парадзе маскоўская пралетарская дывізія—дывізія пралетараў маскоўскіх фабрык і заводаў. Гэтую дывізію дапаўняла сводная студэнцкая дывізія.

Атрады чырвоных санітарак, чырвоных сясьцёр сустракаюцца гучнай авацыяй. Атрады ТДА-Авіяхіму выклікаюць асаблівае захапленьне прысутных. За пяхотай праехалі самакатчыкі, аўтамабільныя часьці з кулямётамі, панцырнікі і інш. Доўгай істужкай мільгацелі матарызаваныя часьці розных галін зброі, дэманструючы дасягненьні сучаснае вайсковае тэхнікі. За аўтамабільнымі часьцямі праехала кавалерыя і артылерыя. Гураганам праляцеді тачанкі спэцыяльнага дывізіёну войск АДПУ і ліхія эскадроны конных палкоў. У канцы параду ў паветры пачулася гудзеньне матораў, паказалася шмат самалётаў.

У 11 гадзін 50 хв. пачалося дэфіляваньне па райёнах. З пляцу Рэвалюцыі, Цьвярсков, Манэжнае і Нікольскае вуліц пацяклі на Чырвоны пляц шырокія калёны дэманстрантаў. Замільгацелі плякаты, сьцягі, карыкатуры, вытворчыя эмблемы, шчыты з розными малюнкамі. Часьцей іншых сустракаліся плякаты з лёзунгамі: «Няхай жыве будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі», „Наперад да індустрыялізацыі краю", «Руйнуючы агонь проці ўсякіх апартуністычных ухілаў»; моцна і гучна гучэлі бытавыя лёзунгі, накіраваныя проці п'янства, рэлігіі і хуліганства. Шмат шчытоў было прысьвечана аднаму з найбольш злых ворагаў новага быту—«расейскай горкай». Шмат якія фабрыкі і заводы вышлі на дэманстрацыю з табліцамі і дыяграмамі, якія адбіваюць посьпех гаспадарчага росту. На трыбуне маўзалею ў часе праходу калён прысутнічалі т. т. Сталін, Калінін, Рыкаў, Бухарын, Молатаў, Куйбышаў, Арджанікідзэ, Угланаў, Котаў, Міхайлаў і інш. З маўзалею бязупынна нясуцца галасы: „Наперад да, Сусьветнага Кастрычніка", «Наперад, за індустрыялізацыю краю». Гэтыя галасы і адказнае моцнае «ура» доўга абуджалі пляц. Да 4-х гадзін каля маўзалею праходзілі калёны рабочых, работніц, чырвоаармейцаў, вучняў. Водлуг прыблізных падрахункаў, у дэманстрацыі брала ўдзел звыш паўміліёну чалавек.

Наперад па праверaным шляху!

Прамова тав. Калініна на парадзе на Чырвоным пляцы 7-га лістапада.

Таварышы! Па даручэньні ўраду і партыі вітаю рабочых, сялян, армію і ўсіх грамадзян Савецкага Саюзу з 11-мі ўгодкамі Кастрычніка. Кожныя новыя ўгодкі савецкага ладу, кожныя новыя ўгодкі вялікага Кастрычніка нясуць шмат новых дасягненьняў Савецкаму Саюзу. З першага моманту існаваньня Саветаў белагвардзейцы, ворагі рабочае клясы і працоўнага сялянства прарочылі, варажылі на гушчы кавы блізкую і хуткую пагібель савецкаму ладу. Яны гэтую сваю надзею на трацяць і дасюль, але, як было і дасюль, сурова памыляюцца. Савецкі Сацыялістычны Саюз як быў, так і застанецца непадступным, непарушным гранітным мурам. Дзівакі. Натуральныя перашкоды на шляху вялічэзнага развіцьця нашае гаспадаркі, культуры і тэхнікі яны лічаць надзейнымі для сябе адзнакамі. Ну што-ж, нехай яны цешацца такім салодкім самаашуканам: ён палегчыць ім шлях на той сьвет. Мы-ж ізноў і ізноў удзесяцяраем нашыя натугі, а нашыя посьпехі ўжо наяўны. Нічэ так нядаўна ўся ўвага пралетарыяту і працоўнага сялянства была накіравана на такую вялічэзную пабудову, як Волхаўстрой. І вось воды Волхаўстрою кружаць машыны ленінградзкіх фабрык і асьвятляюць рабочыя кватэры. Зараз закоўваецца суседняя рэчка Сьвір. Пралетарыят прымусіць яе таксама служыць сабе. Зараз будуецца станцыя, якая будзе ўдвальт большаю за Волхаўстрой. Але, таварышы, мы зараз не заўважаем гэтае пабудовы. Яна нам здаецца нармальнаю, натуральнаю, чарговаю, штодзённаю пабудоваю, хоць яна і большая за Волхаўстрой. Вартым увагі ўсяго Саюзу вяўляецца і волат-Днепрастрой, Самарэчанская чыгунка і такія мерапрыёмствы, як выдача сёлета 100 міліёнаў рублёў на ўсьвяцьце палі ны ад роду нераспаханае зямлі, якая цяпер абарачваецца ў савецкія гаспадаркі. Гэта паказвае той вялічэзны рост, які адбіваецца ў Савецкім Саюзе.

Таварышы! Тыя вынікі, якія зьяўляюцца наяўнымі для ўсіх рабочых і сялян, даюць нам упэўненасьць, што мы будзем і надалей ісьці тым шляхам, якім ідём зараз з поўнаю ўпэўненасьцю ў перамогу сусьветнага пралетарыяту. «Ура».

Падарункі 11-му Кастрычніку.

МАСКВА, 8-XI. З усіх канцэў РСФСР паведамляюць аб масавых дэманстрацыях у зьвязку з XI гадавінай Кастрычніка. У Растове-на-Доне ў дэманстрацыі ўдзельнічала звыш ста тысяч чалавек. У Омскай акрузе сьвяткаваньне адзначалася адчыненьнем хат-чытальняў, правядзеньнем дню ўраджаю і сельска-гаспадарчае выстаўкі. У Цюкалінску адчынен дом селяніна. У Чарапэўцы адбылося ўрачыстае адчыненьне мэханізаванага хлебазаводу. У Казакстане ў Карэнкпаі, у прысутнасьці рабочых і прадстаўнікоў ураду і партыі адбыўся пуск магутнага мядзяна-плавільнага заводу. У Сырдар'еўскай акрузе пачала працаваць тэлефонная лінія, даўжынёю ў 300 клм., вязьваючая акруговы цэнтр з шэрагам аўлаў і вёшкаў. У Іжэўску скончана восем 3-х паверховых дамоў, куды пераходзяць рабочыя. У Севастопалі адбылася закладка помніка Леніну, а таксама адчынен дыспансэр для сухотнікаў. У Якуцку ўрачыста адчынен помнік Леніну і г. д.

Прыём у заграніччных пасольствах СССР

ПАРЫЖ, 8-11. У дзень угодак Кастрычніка на прыёме ў пасольстве СССР прысутнічалі пралетаўніі міністэрства замежных спраў і дыпляматычнага корпусу, у тым ліку паслы Нямеччыны і Турцыі, а таксама шматлікія прадстаўнікі грамадзкасьці, гандлю і прамысловасьці, дзеячы навукі і мастацтва, прадстаўнік міністэрства замежных спраў перадаў т. Даўгалёўскаму прывітаньне Брыяна.

* * *

БЭРЛІН, 8-XI. На прыёме, наладжаным учора пасольствам СССР у адзнаку 11-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі, прысутнічала некалькі сот выдатных прадстаўнікоў палітыкі, эканоміі, навукі і мастацтва. Дыпляматычны корпус быў прадстаўлен паслами Францыі, Італіі, Японіі і Турцыі і шмат якімі пасланьнікамі. Прысутнічалі таксама шматлікія дэпутаты і выдатныя прадстаўнікі навуковага сьвету.

* * *

ВЕНА, 7-XI Сёньня ў венскім паўнамоцным прадстаўніцтве СССР адбыўся прыём у адзнаку 11-х угодак Кастрычніка. На прыёме прысутнічалі шматлікія прадстаўнікі дыпляматычнага корпусу, прадстаўнікі аўстрыйскага ўраду, кіруючыя дзеячы культуры і мастацтва, гандлёва-прамысловых колаў, аўстрыйскага і замежнага друку—разам блізка 300 чалавек.

АНГОРА, 7-XI. У паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Ангоры адбыўся прыём у адзнаку 11-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі. На прыёме прысутнічалі старшыня ангорскага міністэрства, міністэр замежных спраў, старшыня парляменту, некалькі міністраў і дыпляматычны корпус.

ПАВІНШАВАНЬНЕ АД ЯПОНСКІХ УРАДУ І ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

ТОКІЁ, 8-XI. Прэмʼер Танака, усе сябры ўраду, а таксама міністэрства замежных спраў, некаторыя службовыя асобы, прадстаўнік дзелавога сьвету, літаратуры і іншых галін грамадзкага жыцьця Японіі павіншавалі паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР з угодкамі Кастрычніка.

ПРЫВІТАНЬНІ ПЕКІНСКАМУ КОНСУЛЬСТВУ СССР.

ПЕКІН. З прычыны 11-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі консульства СССР у Пекіне атрымала прывітаньні ад нямецкага пасольства, даверанага ў справах Нарвэгіі і ўпаўнаважанага панкінскага ўраду.

Ушануем памяць загінуўшых за Кастрычнік.

ЦВК СССР зьвярнуўся да цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік, савецкіх грамадзкіх арганізацый і ўсіх працоўных Саюзу ССР, з адозвай, у якой між іншым гаворыцца:

У прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР падыходзяць матэрыялы паведамленьні ад грамадзкіх арганізацый аб тым, што на мясцох міркуюць у дні 11-е гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўшанаваньне памяці загінуўшых у часе грамадзянскае вайны барацьбітоў рэвалюцыі.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР лічае гэтую ініцыятыву працоўных мас і лічыць патрэбным ахапіць намечанай кампаніяй па увекавечаньні памяці загінуўшых чырвоных барацьбітоў рэвалюцыі вялікую планамернасьць і стварыць такія ўмовы, пры якіх-бы быў забясьпечан удзел у ёй шырокіх працоўных мас.

11-я гадавіна Кастрычніка—гэта адначасна гадавіна нашых перамог на гаспадарчым фронце, нашых дасягненьняў у галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя дасягненьні падрыхтаваны ранейшымі посьпехамі на фронце грамадзянскае вайны, невядомыя магілы герояў-рэвалюцыянэраў, якое раскіданы па ўсёй тэрыторыі нашае шматнацыянальнае савецкае дзяржавы.

Таму нашыя кастрычнікавыя ўрачыстасьці, зьвязаныя з днямі падрахаваньня вынікаў нашых перамог і нашых дасягненьняў, у той-жа час вяўхіла навіны зьвяданна днямі ўспамінаў аб загінуўшых за вялікую справу таварышох, днямі, у якія ўсе працоўныя павінны аддаваць вядомую пашану іх памяці.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР мяркуе, што мерапрыёмствы, зьвязаныя з увекавечаньнем памяці загінуўшых барацьбітоў рэвалюцыі павінны з аднаго боку, дапамагаць культурна-асьветнай працы як у горадзе, так і на вёсцы, маючы на ўвазе арганізацыю культурных ачагоў імя загінуўшых герояў у гістарычных мясцовасьцях, зьвязаных з грамадзянскай вайной і, з другога боку, забясьпечваць упарадкаваньне месц братарскіх магіл герояў грамадзянскае вайны. Гэтыя мерапрыёмствы павінны ажыцьцёвіць задачу абярнуць месцы боек і братарскіх магіл у помнікі, якія сьведчылі-б аб вялікіх учынках герояў грамадзянскае вайны і давалі заклік да далейшых перамог.

Савецкая грамадзкасьць павінна выказаць ініцыятыву ў арганізацыі па ўсім Саюзе ССР ва ўсіх гарадох і селішчах гутарак і вечароў, зьвязаных з увекавечаньнем памяці паўшых барацьбітоў рэвалюцыі.

Месцы [illegible] гэрычных боек і магілы загінуўшых ставяць [illegible] увагі і клопат усіх мясцовых органаў улады і працоўных рабочых і сялян. Разам з тым Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюзу ССР упэўнен, што цэнтральныя выканаўчыя камітэты саюзных рэспублік абагуляць вопыт па правядзеньні адпаведных мерапрыёмстваў на мясцох, паглыбіць і разгорнуць працу, зьвязаную з увекавечаньнем памяці чырвоных герояў і тым самым, створаць умовы, неабходныя для правядзеньня мерапрыёмстваў усесаюзнага характару па ўвекавечаньні памяці ахвяр грамадзянскае вайны.

Прамені Кастрычніка над царствам капіталу.

10.000-я дэманстрацыя ў Парыжы.

ПАРЫЖ, 8-XI. Сьвяткаваньне 11-х угодак Кастрычніка, наладжанае французкім таварыствам прыяцеляў СССР, прыцягнула больш 10-ці тысяч удзельнікаў. Прамовы выступаўшых прамоўцаў, а таксама прывітальны ліст Ромэн Раляна спатканы гучнымі авацыямі і выгукамі—«няхай жывуць саветы».

На сьвяткаваньні, наладжаным кампартыяй і ўнітарнай канфэдэрацыяй працы ў Буржы, прысутнічала больш тысячы чалавек, а на сьвяткаваньні, наладжаным саюзам расейскіх рабочых у Францыі—1.200 чалавек.

ГОЛАС КІТАЙСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА ПАДПОЛЬЛЯ.

ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ЧЭСЬЦЬ КАСТРЫЧНІКА Ў ШАНХАІ.

ШАНХАІ, 8-11. «Норт Чайна Дэйлі Ньюс» паведамляе, што 7-га лістапада з прычыны Кастрычнікавых угодак у Шанхаі было наладжана некалькі мітынгаў кітайскіх камуністаў. Водлуг слоў газэты, па горадзе параскідана шмат праклямацый і лістовак з заклікам заснаваць савецкі ўрад, змагацца з Гаміндаанам, аднавіць зносіны з СССР, змагацца проці [illegible] небясьпекі новае вайны. У розных мясцох гораду зьявіліся таксама агітацыйныя плякаты.

КАСТРЫЧНІКАВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАЛЕТАРЫЯЎ НЯМЕЧЧЫНЫ

БЭРЛІН, 7-XI. З прычыны 11-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі і 10-х угодак з таго часу, як была скінута манархія ў Нямеччыне, сёньня раніцою па ўсёй Нямеччыне адбываюцца рэвалюцыйныя дэманстрацыі, наладжаныя кампартыяй.

КАНФІСКАЦЫЯ ГАМБУРСКАГА ОРГАНУ КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 8-XI. Камуністычная газэта «Гамбургер Фолькс Цэйтунг», якая зьмясьціла артыкул, прысьвечаны 11-м угодкам Кастрычнікавае рэвалюцыі, канфіскавана ва[illegible] загаду начальніка гамбурскае паліцыі, сацыял-дэмакрата Шэнфельдэра.

ЗАБАСТОЎКІ Ў ЛАТВІІ Ў ДЗЕНЬ КАСТРЫЧНІКА.

РЫГА, 8-XI. 7-га лістапада ў Рызе і іншых гарадох Латвіі адбываліся частковыя забастоўкі. Было параскідана шмат адозваў і вывешана шмат чырвоных сьцягаў з рэвалюцыйнымі лёзунгамі.

Гвалты польскага фашызму над украінцамі.

ПРАДСТАЎНІКІ ЎЛАДЫ АПРАЎДВАЮЦЬ ЛЬВОЎСКІХ ПАГРОМШЧЫКАЎ.

Капітуляцыя згодніка ў УНДО перад пілсудчынай.

ВАРШАВА, 7-XI. У панядзелак і аўторак у Львове здарыліся асобныя стычкі між украінцамі і палякамі. Асабліва вострыя схваткі мелі месца ва ўнівэрсытэтах у зьвязку з пастановаю польскіх студэнтаў ня ўпушчаць украінскіх студэнтаў у будынкі вышэйшых навучальных устаноў.

У ЛЬВОВЕ АДБЫЛІСЯ МАСАВЫЯ АРЫШТЫ; АРЫШТАВАНА 80 УКРАІНСКІХ СТУДЭНТАЎ. *Чакаюць, што 11-га, у дзень 10-х угодак польскае незалежнасьці, у Львове могуць аднавіцца непарадкі.*

Супрацоўніца газэты «Діло», выкінутая польскімі студэнтамі з другога паверху на вуліцу, памёрла ад пералому ног і рук.

Львоўскі ваявода заявіў, што віноўнікамі здарэньня ў Львове зьяўляюцца самі украінцы, бо яны справаковавалі польскае жыхарства. Украінскія колы абураны заяваю ваяводы, лічачы, што яна зьяўляецца апраўданьнем граміл.

Украінскія дэпутаты падалі ў сойм сьпешнае запытаньне наконт львоўскіх падзей. Запытаньне патрабуе назначыць спэцыяльную сьледчую камісію сойму, даць адстаўку ваяводзе і выплаціць грашовыя страты. Прамова дэпутата УНДО Хруцкага ў сойме была вытрымана таксама ў прымірэнчым тоне. Міністр унутраных спраў Складкоўскі ў адказе Хруцкаму заявіў, што віну за львоўскія падзеі нясуць тыя украінскія колы, якія супярэчаць устанаўленьню мірнага супольнага жыцьця між украінцамі і палякамі. Складкоўскі заявіў, што ўрад мае [illegible] сілы, каб прадушыць у аснове ўсе непарадкі і, нарэшце, што паліцыя [illegible] сябе ў Львове нават вельмі мякка. Пасьля прамовы Складкоўскі украінскія дэпутаты паўставалі з месца і прасьпявалі украінскі нацыянальны гімн.

У палітычных колах падкрэсьліваюць, што чаканы «вялікі украінскі дзень» у сойме прайшоў цьмяна.

МОЦНЫ ЎДАР ПА УКРАІНСКІХ ЗГОДНІКАХ.

НЯГОДНЫЯ СПРОБЫ АБВІНАВАЦІЦЬ ЗА ПАДЗЕІ „ТРЭЦІ БОК".

ВАРШАВА, 5-XI. Увесь дзень у суботу ў Львове было трывожнае становішча. Чакалі аднаўленьня боек. Горад рабіў уражаньне ўзброенага лягеру. У розных пунктах гораду чуліся стрэлы. Паліцыя ўвесь час знаходзілася ў баявой гатоўнасьці. На дапамогу львоўскай паліцыі былі выкліканы паліцэйскія атрады з Варшавы і Любліну.

Крывавыя падзеі ў Львове вырабілі прыгнятаючае ўражаньне ў блізкіх да ўраду палітычных колах, якія бачаць у іх моцны ўдар па украінскіх згодніцкіх элементах. Афіцыёзная «Эпоха» ухіляецца наогул пісаць пра львоўскія падзеі. Іншыя органы друку спрабуюць абвінаваціць у падбухторстве украінцаў СССР і Нямеччыну. Усе газэты ставяць у сувязь з падзеямі ў Львове замах украінцаў на польскага консула ў Празе. «Рэспубліка» піша: Львоўскія падзеі былі арганізованы для таго, каб зьвярнуць грамадзкую ўвагу Эўропы на украінскую праблему".

Орган польскіх студэнтаў у Львове выпусьціў экстранны нумар, у якім адкрыта заяўляе, што саюз польскіх студэнцкіх арганізацый бярэ на сябе поўную адказнасьць за разгром „Діло" і іншых украінскіх устаноў і пратэстуе проці спроб некаторых газэт прыпісаць гэтыя ўчынкі злачынным элементам.

НАЖЫМ НА НЯМЕЦКІХ МЭТАЛЁЎЦАЎ З ТРОХ БАКОЎ.

ФАБРЫКАНТЫ, ГАНДЛЯРЫ, САЦЫЯЛ ПРАДАЖНІКІ І ЎРАД НАМЕРАНЫ ЛІКВІДАВАЦЬ ГЭРАІЧНУЮ БАРАЦЬБУ Ў РЭЙНСКА-ВЭСТФАЛЬСКІМ РАЙЁНЕ.—ЛЁКАУТАВАНЫЯ МАСЫ ДАРУЧАЮЦЬ КАМПАРТЫІ КІРАЎНІЦТВА СТАЧКАЙ.

6-ты дзень лёкауту.

БЭРЛІН, 8-11. Становішча ў Рэйнска-Вэстфальскай вобласьці абвастраецца в прычыны згрупаваньня там і абураючых паводзін вялікіх паліцэйскіх сіл, а таксама пасрэдніцкае дзейнасьці рэфармістаў і ўлады, якая імкнецца ліквідаваць канфлікт шляхам уступкі прадпрыёмцам у пытаньні аб даўжыні працоўнага дню.

Згодна загаду прускага міністра ўнутраных спраў сацыял-дэмакрата Грэвэнскага, Эсэн аборкуты ў центр, адкуль павінны, у разе патрэбы, быць ужыты захады «па аднаўленьні парадку». Вайсковая паліцыя знаходзіцца ў баявой гатоўнасьці.

У Дусэльдорфе адбылася дэманстрацыя мэталёўцаў, наладжаная камуністычнай партыяй. Паліцыя адкіла дэманстрантаў шлях да ратушы, у выніку чаго здарыліся стычкі. Не зважаючы на супярэчаньне паліцыі, рабочыя давялі дэманстрацыю да канца. Дэманстрацыя прайшла пад камуністычнымі лёзунгамі.

У Гамборне паліцыя забаранила ўсе дэманстрацыі ў межах гораду на ўвесь час лёкауту. Саюз гуртавых гандляроў прапанаваў рознымгандлярам опыніць продаж лёкаўтаваным рабочым тавараў на даўжэр.

Водлуг вестак «Ротэ Фанэ», між прадстаўнікамі прафсаюзаў і заводчыкаў распачаліся ранэйшыя перамовы. Прадпрыёмцы дамагаюцца працягнуць тэрмін угавору, які траціць сваю моц 3-га сьнежня і водлуг умоў якога працоўны дзень цягнецца 10-12 гадзін. Замест гэтага прадпрыёмцы згаджаюцца крыху павялічыць заработак, але менш чымся прадугледжана трацейскаю пастановаю. Афіцыйным паведамлянам мяркуецца назначыць прускага міністра гандлю дэмакрата Шрэйдэра.

Разгляд іску аб стратах ад лёкауту, учыненага прафсаюзам ганчае прамысловасьці Рэйнска-Вэстфальскае вобласьці, назначаны ўпачатку працоўным судом на 16-га лістапада, перанесен згодна патрабаваньня міністра працы на 12-га лістапада.

Вынікі лёкауту ў мэталёвай прамысловасьці выяўляюцца ўсё больш і больш. Надыходзіць опыненьне працы на прадпрыёмствах па здабычы ваны і на прадпрыёмствах па вырабе агнятрывалых матар'ялаў. Поруч з вугольнай прамысловасьцю больш за ўсё пацярпеў транспарт. У рачных партох прымежных в рэйнскам лёкауту мяжовасьцяў, асабліва на вугольных і рудных партох Дортмунду, надыходзіць звальненьне вялікага ліку рабочых.

Лёкаутаваныя кінуты ў абоймы голаду.

ЛЕНШАВІКІ АПЭЛЮЮЦЬ ДА...СУМЛЕНЬНЯ ФАБРЫКАНТАЎ.

БЭРЛІН, 8-XI. Спрэчкі наконт лёкауту, якія адбываліся ўчора ў прускім ляндтаге, скончыліся заявою прускага ўраду (у склад яго ўваходзяць сацыял-дэмакраты), што ён на можа адгукнуцца на прапановы аб дапамозе лёкаўтаваным, пададзеныя камуністамі, сацыял-дэмакратамі і партыяй цэнтру. Сацыял-дэмакратычныя прамоўцы апэлявалі... да сумленьня прадпрыёмцаў і суду. Толькі прамоўцы-камуністы выкрылі палітычнае і эканамічнае значэньне сучаснае барацьбы, выкрыўшы адначасна супрацоўніцтва рэфармісцкага кіраўніцтва прафсаюзаў і дзяржаўнага апарату з прадпрыёмцамі.

Усе прапановы аб дапамозе лёкаўтаваным перададзены ў гандлёва-прамысловую камісію ляндтагу большасьцю ўсіх галасоў проці камуністычных.

Няма давер'я сацыял-здраднікам

Начале барацьбы масы ставяць кампартыю.

БЭРЛІН, 7-11. Пад уплывам агітацыйнае і арганізацыйнае працы кампартыі барацьба лёкаўтаваных мэталёўцаў Рэйнска-Вэстфальскае вобласьці набывае ўсё больш баявы характар. Водлуг вестак «Ротэ Фанэ» лік лёкаўтаваных, якія абралі самастойныя стачачныя камітэты, дасягае ўжо 50-ці тысяч.

Баявы настрой робочых характарызуецца, між іншым, і тым, што скліканы Бохумскім аддзелам рэфармісцкага аб'яднаньня прафсаюзаў сход 5-ці тысяч лёкаўтаваных [illegible]ганьбіў тактыку рэфармістаў. У знак пратэсту рэфармісцкі прэзыдыум сходу пакінуў залю. Сход абраў новы прэзыдыум з прадстаўнікоў левае меншасьці і пасьля жвавых спрэчак склаў стачачны камітэт, у які ўвайшло 4 беспартыйных і 3 камуністы. Сход лёкаўтаваных у Гамборне выказаў [illegible]давер'е стачачнаму камітэту, склад[illegible] прафсаюзнымі [illegible]ракратамі. У [illegible] лёкаўтаваныя абралі, [illegible] жаючы на спробы рэфармістаў перашкодзіць гэтаму, стачачны камітэт, у складзе якога бо[illegible] шасьці—прадстаўнікі лев[illegible] шасьці [illegible]

ЗАКЛІК КАМПАРТЫІ ДА МАБІЛІЗАЦЫІ МАС ПРОЦІ КАПІТАЛУ.

БЭРЛІН, 8-XI. Агульна-нямецкая канфэрэнцыя камуністычнае партыі агаласіла адозву, у якой прапануе ўсім арганізацыям партыі і левае меншасьці прафсаюзаў распачаць мабілізацыю самых шырокіх мас, каб заснаваць рэвалюцыйны адзіны фронт у эканамічных бойках. Кампартыя прапануе разьвязваць і весьці эканамічныя бойкі таксама і проці волі рэфармістаў, заснаўваючы ў такіх выпадках стачачныя камітэты ў складзе прадстаўнікоў усіх рабочых, удзельных у канфлікце, і наладжваючы на працуючых прадпрыёмствах дэманстрацыі спачуваньня змагаром, мітынгі, вулічныя маніфэстацыі і грашовыя зборы поруч з самай шырокай кампаніяй растлумачэньня.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ ПЕРАМОВЫ СКОНЧЫЛІСЯ ЎПУСТУЮ.

УСЕ СПРЭЧНЫЯ ПЫТАНЬНІ ЗАСТАЛІСЯ НЕРАЗЬВЯЗАНЫМІ. ДАСЯГНУТА ТОЛЬКІ ЗГОДА АБ ПРЫМЕЖНЫХ ЗНОСІНАХ.

КЕНІГЗБЭРГ, 7-XI. На апошнім плянарным пасяджэньні польска-літоўскае канфэрэнцыі ў Кёнігзбэрзе Вальдэмарас сказаў паўтарагадзінную прамову, у якой спынуўся на ўсіх польска-літоўскіх спрэчных пытаньнях.

Пасьля адказу Залескага і заўвагі Вальдэмараса, Залескі зрабіў такую заяву: „Польска літоўскі канфлікт азначае ня толькі пастаянную пагрозу для нармальнага разьвіцьця абедзьвюх дзяржаў, але і наносіць сур'ёзную шкоду эканамічным інтарэсам трэціх дзяржаў. Не зважаючы на нясупынныя захады польскага ўраду, канфэрэнцыя ня прышла ні да якога станоўчага выніку, апроч канвэнцыі аб мясцовых прымежных зносінах, значэньне якое вельмі абмежавана. Калі літоўскі ўрад выкажа жаданьне аднавіць з Польшчаю перамовы на аснове, якая дасьць надзею на дасягненьне станоўчых вынікаў, дык польскі ўрад ня ўхіліцца ад новае спробы наладзіць, нарэшце, між гэтымі двума краямі нармальныя адносіны».

Вальдэмарас у адказе на гэтую заяву Залескага не згаджаўся з поглядам Залескага, што канфэрэнцыя пацярпела канчатковае крушэньне. На думку Вальдэмараса, ужо адно ўпарадкаваньне мясцовых зносін праз дэмаркацыйную лінію азначае не малую палёгку для значнага ліку жыхароў прымежнага райёну. Спыняючыся на заявэньнях Залескага наконт чыстаты намераў і мірных настрояў Польшчы, Вальдэмарас напомніў інтэрвʼю Пілсудзкага летась увосень, калі Пілсудзкі, у зьвязку з польска-літоўскімі адносінамі, заявіў, што ён усю ночня спаў, разьвязваючы пытаньне, ці павінен ён мабілізаваць польскую армію. Потым Вальдэмарас зазначыў на гістарычную сувязь Літвы з Вільняю. У галоўным пункце польска-літоўскага канфлікту ня можа быць дасягнута ніякае згоды, пакуль ня будзе выпраўлена несправядлівасьць, учыненая ў адносінах да Літвы. Нарэшце Вальдэмарас заявіў, што Літва ня лічыць перамовы скончанымі, а толькі перарванымі.

Пасьля прамовы Вальдэмараса канфэрэнцыя была зачынена.

Адстаўка ўраду Пуанкарэ.

ПАРЫЖ, 6-XI. «Журналь» паведамляе, што зьезд радыкальнае партыі павінен быў скончыцца 6 лістапада ўдзень; аднак, згодна дамаганьня Кайё, заключнае пасяджэньне адбылося ўнач каля [illegible] пасьля выезду міністраў [illegible]йля і Саро, у прыч[illegible]. Па[illegible] [illegible]зяліла далучыць да дэклярацыі партыі адзіленую папярэдадні папраўку Дарыё, якая прапануе міністрам-радыкалам выйсьці з складу ўраду. У зьвязку з гэтым міністры-радыкалы падалі Пуанкарэ заяву аб адстаўцы.

Водлуг апошніх вестак агентства Гаваса, урад Пуанкарэ і [illegible] ў адстаўку.

12-га лістапада г. г. а 10 гадзіне раніцы ў залі пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК адбудзецца пасяджэньне камісіі па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР.

ПАРАДАК ДНЮ НАСТУПНЫ:

1. Даклад Менскай, Віцебскай і Магілёўскай акруговых камісій аб праведзеных мерапрыёмствах па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР па іх акругах.

2. Даклад тав. КРОХМАЛЯ аб мерапрыёмствах па падрыхтоўцы Чырвонай армії да сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя

Сьвята Кастрычніка ў Менску.

ВЯЛІКІЯ УГОДКІ.

6-га лістапада, а 7-ай гадзіне ўвечары, у Доме Культуры адбылося ўрачыстае пасяджэньне Менскага гарсавету з удзелам—ураду БССР, партыйных, грамадзкіх і прафесыянальных арганізацый.

Адчыняючы ўрачыстае пасяджэньне, старшыня Менскага гарсавету тав. Яцкевіч запрапанаваў ушанаваць памяць загінуўшых барацьбітоў і памёршых бальшавікоў, якія змагаліся за Кастрычнік. (Усе ўстаюць, музыка выконвае жалобны марш).

У сваёй прамове т. Яцкевіч спыніўся на значэньні вялікай урачыстасьці.

— Сёньня,—кажа прамоўца,—мы сьвяткуем вялікую гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі, дзень, калі рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўзяла ўладу ў свае рукі і пачала будаваць сацыялістычную гаспадарку.

Кожны год, сьвяткуючы гэты вялікі дзень, правяраем пройдзены шлях і адзначаем усё новыя і новыя дасягненьні.

Шпарка расьце наша прамысловасьць, сельская гаспадарка, асабліва яе сацыялістычны сэктар; расьце наш бюджэт. Усё больш і больш мацнее сувязь гораду з вёскай, усё больш павялічваецца ўплыў рабочае клясы на сялянства. Больш і больш расьце культурнае разьвіцьцё працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

Расьце таксама наш уплыў на працоўных іншых краін. Больш уважліва пачынаюць яны прыглядацца да нашага жыцьця, бяручы прыклад з працоўных Савецкага Саюзу, узмацняючы сваю барацьбу з буржуазеяй.

Радыё-пераклічка савецкіх рэспублік.

Роўна а 9-й гадзіне ўвечары распачалося на радыё ўзаемнае павіншаваньне з наступленьнем сьвята Вялікай Гадавіны прадстаўнікоў ураду паасобных рэспублік Савецкага Саюзу. Перадавалі павіншаваньні: старшыня ЦВК СССР тав. Калінін, старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў, старшыня СНК Украіны тав. Чубар, старшыня Ленінградзкага Савету т. Камароў, старшыня Закаўкаскіх Савецкіх Федэратыўных Сацыялістычных Рэспублік тав. Эліава. Павіншаваньні прадстаўнікоў ураду Саюзных рэспублік. Сход сустракаў доўга-нясьцихаючымі воплескамі. У гэты вялікі вечар за тысячы кіл. перадавалі працоўныя адзін другому свае лепшыя пажаданьні, свае прывітаньні з прычыны наступленьня Вялікага сьвята.

Прывітальная прамова т. Чарвякова.

— Ад імя рабочых, сялян і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі і іх рабоча-сялянскага ўраду перадаю шчырае, таварыскае прывітаньне з прычыны XI Кастрычніка пралетарыям і працоўнаму сялянству ўсіх рэспублік Савецкага Саюзу.

Таварышы! Працоўныя Савецкай Беларусі, знаходзячыся ў непасрэдным дачыненьні з буржуазнымі дзяржавамі і маючы магчымасьць ведаць праўду аб становішчы працоўных буржуазных краін, асабліва моцна разумеюць значэньне Вялікага Кастрычніка, які прынёс вызваленьне працоўным нашай краіны.

Кастрычнік вызваліў Беларусь ад панаваньня абшарнікаў, капіталістаў, царскіх жандараў. Кастрычнік зрабіў Беларусь вольнай савецкай краінай, часткай Вялікага Савецкага Саюзу. А там, за рубяжом, панаваньне буржуазеі ня спыняецца і прымае ўсё больш жудасныя формы фашысцкі тэрор.

Кастрычнік зрабіў пралетарыяў гаспадарамі ўсяе народнае гаспадаркі, перадаў сялянству абшарніцкую зямлю, даў штуршок да гаспадарчага адраджэньня ўсяе краіны. Там, за рубяжом, ня спыняецца панаваньне эксплёатацыі і абжабраваньне народных мас: капіталісты і абшарнікі купаюцца ў роскашы за кошт прыбытку і звышпрыбытку ад прамысловасьці і сельскай гаспадаркай, за кошт поту і крыві рабочага і селяніна.

Кастрычнік вынішчыў нацыянальны ўціск, зрабіў працоўных усіх нацыянальнасьцяў Беларусі—беларусаў, расейцаў, яўрэяў, палякаў, літоўцаў, латышоў і інш. роўнымі.

Нацыянальны ўціск застаецца і да гэтага часу адной з галоўных асноў існаваньня буржуазнага ладу; адначасова з узмацненьнем рэвалюцыйнай барацьбы ў краінах капіталу ідзе ўзмацненьне ў іх нацыянальнага ўціску.

Кастрычнік, вызваліўшы Беларусь ад палітычнага, эканамічнага і нацыянальнага прыгнечаньня, адрадзіў сілы рабоча-сялянскіх мас нашай краіны і, забясьпечыўшы сталае падтрыманьне і дапамогу з боку Савецкага Саюзу, даў магчымасьць нам ставіць і вырашаць задачы гаспадарчага і культурнага адраджэньня Беларусі і палепшаньня становішча народных мас.

За 8 год мірнае працы Савецкая Беларусь супольна з працоўнымі Савецкага Саюзу змагла залячыць свае раны і распачаць плянавае сацыялістычнае будаўніцтва. Сёньня, у дзень XI гадавіны Кастрычніка, мы, працоўныя Савецкай Беларусі, з гонарам адзначаем, што, ня гледзячы на вялікую беднасьць нашай краіны і цэлы шэраг іншых цяжкасьцяй, мы змаглі дабіцца настолькі значных вынікаў у галіне адбудовы і разьвіцьця гаспадаркі і культуры, што нават нашы клясавыя ворагі заграніцаю прымушаны прызнаць нашы дасягненьні.

Зразумела, цяжкасьці наперадзе яшчэ вялікія, **але пачатак будаўніцтва сацыялізму ўжо закладзен і перамога сацыялізму** робіцца ўсё ясьней ад Мазырскіх балот Палесься да Полацкіх вазёр—з усіх куткоў Беларусі чуцен стук пралетарскага малатка і лязг сялянскага плуга, якія замацоўваюць асновы сацыялізму. Гэта ўжо не аддалены глухі шум, а моцныя ясныя гукі, якія, зліваючыся разам, утвараюць магутную песьню працы, барацьбы і перамогі.

Савецкая Беларусь дасканала разумее, што ўсе яе заваёвы ў мінулым і посьпехі ў будучыне залежаць ад захаваньня і ўзмацненьня саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту.

Таму ў дні XI гадавіны Кастрычніка Савецкая Беларусь пасылае сваё асаблівае шчырае прывітаньне расейскаму пралетарыяту і правадыру сацыялістычнай рэвалюцыі—камуністычнай партыі.

Наша братэрскае прывітаньне таксама Савецкім Рэспублікам, якія падобна нам былі прыгнечаны царызмам і праз Кастрычнік заваявалі сабе вызваленьне.

Няхай жыве Вялікі Кастрычнік!

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Няхай жыве штаб Кастрычніка—камуністычная партыя і яго Ленінскі Цэнтральны Камітэт (доўгія воплескі).

Пасьля прывітальнай прамовы тав. Чарвякоў выступіў з вялікім дакладам **аб 11-годзьдзі Кастрычнікавай рэвалюцыі.**

Працоўныя БССР вітаюць Вялікую гадавіну.

Цэлы шэраг рабочых і сялян выступала з прывітаньнямі з прычыны наступленьня XI гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Чыгуначнік тав. **Барашка** адзначыў, што мы маем ужо значныя дасягненьні ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры. Перад намі стаяць задачы ў галіне далейшага разгортваньня індустрыялізацыі краіны і інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Селянін-дасьледчык Самахвалаўскага раёну тав. **Хмялеўскі** адзначыў, што сялянства трымаецца і будзе моцна трымацца за савецкую ўладу. З палкасьцю юнака гэты 60-цігадовы старык запэўніў савецкую ўладу, што бядняк і серадняк згуртаваліся і вакол саветаў і ня зьвернуць ні ўправа, ні ўлева.

Тав. Хмялеўскі вітае арганізацыю савгасаў і калгасаў—гэтых буйных хлебных фабрык. Бядняк і серадняк,—кажа прамоўца,—зразумелі карысьць калгаснага будаўніцтва і грамадзкай апрацоўкі зямлі, толькі кулацтва супроць гэтага.

Ад імя Чырвонай арміі выступіў з прывітаньнем т. **Крахмаль.**

— Мы можам сьмела заявіць,—адзначыў прамоўца,—што наша Чырвоная армія да 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ня ўступіць у падрыхтоўцы і тэхнічным забесьпячэньні арміі любой капіталістычнай краіны, ня гледзячы на тое, што выдаткі на Чырвоную армію ў нашым бюджэце займаюць нязначнае месца.

Чырвоная армія гатова за выпаўненьня сваіх задач, яна зьяўляецца надзейнай сілай для забесьпячэньня мірнага будаўніцтва сацыялізму, яна зможа абараніць мірную працу рабочых і сялян.

Работніца т. **Русановіч** у сваёй прывітальнай прамове адзначыла шпаркі рост нашае прамысловасьці.

Сход атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад Беларускага Ваеннага Вокругу і працоўных Гомелю.

Рэзалюцыя сходу.

Захлухаўшы даклад тав. Чарвякова аб 11 гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі, нашых дасягненьнях і цяжкасьцях у сацыялістычным будаўніцтве, аб'яднанае ўрачыстае пасяджэньне Менскага Гарсавету разам з членамі ўраду БССР, ЦСПСБ, з удзелам партыйных, прафесыянальных і грамадзкіх арганізацый з вялікім здавальненьнем адзначае, што за чаго ад 10 да 11-й гадавіны Кастрычнікавай Рэвалюцыі зроблены вялізныя посьпехі ў сацыялістычным і культурным будаўніцтве як у горадзе, так і на вёсцы: узмацніўся тэмп будаўніцтва і рэканструкцыі прамысловасьці, узмацнілася праца на калектывізацыі сельскай гаспадарні, маюцца значныя дасягненьні па падняцьці культурнага ўзроўню ўсіх нацыянальнасьцяй і па палепшаньні дабрабыту шырокіх колаў рабочых і сялян, палепшылася праца савецкіх органаў і высунуты новыя кадры рабочых ад варштату і сялян ад плугa ў кіруючыя савецкія і грамадзкія органы.

Пасьпяховае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва не праходзіць бяз цяжкасьцяй. Мы будуем краіну на свае ўласныя сродкі, без чужаземных пазык. Адгэтуль наш рост ідзе часам з вялікімі цяжкасьцямі. Цяжкасьцяй нам не абмінуць—яны зьяўляюцца цяжкасьцямі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, нашага сацыялістычнага росту.

Наступленьне сацыялізму абвастрае супраціўленьне клясавых ворагаў, мы дамо адпор усім, хто адважыцца падняць руку супроць дыктатуры пралетарыяту, хто ста не поперак дарогі да сацыялістычнага будаўніцтва.

Узмацнім агонь супроць кулака, нэпмана шкодніка і бюракрата.

Прэч журбу, ныцьце, хістаньне і панікёрства!

Пралетарыяту, загартованаму рэвалюцыямі—цяжкасьці ня страшны. Далей за ўпартую работу па перамозе цяжкасьцяй. За яшчэ большае ўлягненьне мас у нашае будаўніцтва, за ўмелую самакрытыку, за далейшае рашучае выяўленьне рабочых і работніц, батракоў, беднякоў і сераднякоў на кіруючую работу.

Пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва, рост клясавых супярэчнасьцяй і рэвалюцыйнага руху пралетарыяту ў капіталістычных краінах выклікае злучную нянавісьць імпэрыялістаў да краіны Саветаў да бацькаўшчыны пралетарыяту. Пагэтаму ў 11-ю гадавіну рабочыя, сяляне і ўсе працоўныя яшчэ больш павінны ўзмацняць міжнародную салідарнасьць, яшчэ больш дапамагаць пралетарскім барацьбітам у капіталістычных краінах, яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць краіны Саветаў і дыктатуры пралетарыяту.

На падрыхтоўку нападу капіталістаў і сацыялядраднікаў на СССР пралетарыят усяго сьвету, вясковая беднота, батракі і сераднякі цесна згуртуюцца вакол СССР і ў час калі капіталісты пасьмеюць напасьць на краіну Саветаў усе працоўныя як адзін, стануць на абарону пралетарскай бацькаўшчыны. На падрыхтоўку новай вайны супроць СССР працоўныя адкажуць рашучым узмацненьнем нашай слаўнай Чырвонай арміі і ваенізацыяй працоўных мас і ўзмацненьнем абароназдольнасьці краіны.

На ўзмацненьне барацьбы клясавых ворагаў супроць сацыялістычнага будаўніцтва адкажам згуртаваньнем навакол партыі Леніна!

Адзінства і згуртаванасьць Ленінскай партыі пераможе ўсе цяжкасьці!

За цьвёрдую Ленінскую лінію, за рашучае правядзеньне ў жыцьцё пастаноў 15 Зьезду партыі, за змаганьне супроць усякага апартунізму і примірэнства з ім, за поўную перамогу нашай партыі, за поўную перамогу сацыялізму!

Няхай пануючыя клясы дрыжаць перад камуністычнай рэвалюцыяй!

Няхай жыве 11 год Кастрычніка!

Няхай жыве сусьветная перамога пралетарыяту.

НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК!

Няхай жыве XI Кастрычнік!

Няхай жыве правадыр працоўных—кампартыя!

Гэта гаварылі на толькі лёзунгі і плякаты, якія можна было бачыць на кожным кроку. Гэтыя словы можна было прачытаць на дзесятках і сотнях сьцягаў і транспарантах, з якімі ішлі працоўныя Менску на дэманстрацыю 7-га лістапада.

— Алё! Алё, Алё!.. Зараз будзе перадача з Чырвонага Пляцу з Масквы,—гавораць гучнагаварыцелі на балконе дому Беларускага ўраду.

Па пляцу Волі ў Менску ў гэты-ж час бадзёра рухаюцца калёна за калёнай рабочыя і служачыя менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў.

— Зараз пойдзе на Чырвоным пляцы ў Маскве Чырвоная коньніца. Прадстаўнікі партыі і ўраду яе вітаюць з XI гадавінай Кастрычніка... інфармуе радыё працоўных Менску.

Ур-ра... У-р-р-ра... Гучныя клікі раздаюцца в Масквы...

— Зараз працоўныя Харкава стройнымі шэрагамі ідуць... гаворыць радыё...

Зноў ура! Зноў бадзёрыя маршы музыкі там у Маскве, у Харкаве, у Баку, і тут у нас, у Менску...

А калёны працоўных Менску ўсё ідуць і ідуць накіроўваюцца да пляцу Парыскай Камуны, дзе іх чакае надзейны вартаўнік справы рабочых і сялян—Чырвоная армія.

Радыё, перадае малюнкі дэманстрацыі пралетарыяту СССР.

— Зараз пойдзе чырвоная артылерыя,—і гучнагаварыцель раздаецца грухат калёс гармат.

Зноў прывітаньні прадстаўнікоў партыі, ураду і прафсаюзаў, зноў магутнае ура...

Беларуская радыё-станцыя таксама перадае малюнак параду.

Там, у блізкай нам Заходняй Беларусі і ў Польшчы, рабочыя і сяляне ловяць хвалі Менску, Харкава, Масквы.

Яны чуюць, як пралетарыят Савецкіх рэспублік вольна і радасна сьвяткуе вялікае сьвята свайго вызваленьня.

Няхай жыве Кастрычнік ва ўсім сьвеце,—нясуць электрычныя хвалі покліч рабочых і сялян СССР ва ўсе канцы сьвету...

ПАДАРУНАК ДА XI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

Новы дзіцячы сад.

8 лістапада пры Белдзяржкіне адбылося ўрачыстае адчыненьне дзіцячага саду для дзяцей рабочых і служачых прадпрыемстваў Белдзяржкіно. Дзіцячы сад разьлічан на 25 дзяцей.

Татарская хата-чытальня.

У дні Кастрычнікавых сьвят у Менску на Татарскай вуліцы адбылося ўрачыстае адчыненьне татарскай хаты-чытальні. Хата-чытальня больш-меншдобра абсталявана і забясьпечана адпаведнай літаратурай.

Урачыстая перадача самалёту Імя „Спажывецкая кааперацыя БССР".

У дні сьвяткаваньня 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі адбылася ўрачыстая перадача самалёту „Спажывецкая кааперацыя БССР".

Гэты самалёт пабудован на сродкі, сабраныя на сьмотэме спажывецкай кааперацыі БССР.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

3-га лістапада 1928 г. пад старшынствам тав. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК. Разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ СЭКЦЫЮ ГАРАДЗКОГА САВЕТУ І ЛЕПШЫ СЕЛЬСКІ САВЕТ З ЯГО КАМІСІЯМІ.

У адпаведнасьці з дырэктывай 3-й Сэсіі ЦВК БССР, Прэзыдыумам ЦВК прынята пастанова аб правядзеньні конкурсу на лепшую сэкцыю гарадзкога савету і лепшы сельскі і местачковы саветы з іх камісіямі. Конкурс пачынаецца з 1-га сьнежня 1928 году і павінен быць скончан да 1-га красавіка 1929 г. Асноўнымі задачамі конкурсу зьяўляюцца: праверка работы саветаў з пункту гледжаньня ажыцьцяўленьня імі у сваёй штодзённай працы клясавай лініі; выяўленьне лепшых прыкладаў масавай работы саветаў; выяўленьне ў работе саветаў бюракратызму і іншых хваравітых зьявішч; узмацненьне ролі саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту; праверка выкананьня дырэктыў органаў савецкае ўлады.

Лепшыя па рабоце саветы, сэкцыі і камісіі, а таксама лепшыя карэспандэнцыі аб іх будуць прэміравацца. Для практычнага правядзеньня конкурсу пры Прэзыдыуме ЦВК утворана Цэнтральная Камісія. Пры акрыканкомах, райвыканкомах і гарадзкіх саветах утвараюцца таксама адпаведныя камісіі па правядзеньні конкурсу.

ПРА БАРАЦЬБУ СА ЗЛАЧЫНСТВАМІ Ў БССР.

Зацьверджана пастанова па дакладу НКЮ і садакладу НКУС аб барацьбе са злачынствамі ў БССР.

Прэзыдыум ЦВК прызнаў, што органамі НКЮ правільна праводзілася крымінальна-судовая палітыка ў напрамку ўзмацненьня мер сацыяльнае абароны па найбольш небясьпечных злачынствах і зьніжэньня мер сацыяльнае абароны па злачынствах менш небясьпечных. У асноўным правільнай таксама зьяўляецца палітыка органаў НКУС у галіне дапасаваньня напраўна-працоўных мер уплыву на асоб пазбаўленых волі, узмацненьня арганізацыі майстэрняў, прыстасаваньня зьняволеных да вытворчай працы, узросту культурна - асьветнай працы сярод зьняволеных.

На далейшы час Прэзыдыум ЦВК прызнаў неабходным: рашуча паменшыць ужываньне каротка-тэрміновага зьняволеньня, праз пашырэньне ўмоўнага каротка-тэрміновага пазбаўленьня і больш шырокага ўжываньня іншых мер сацыяльнае абароны (прымусовыя работы, штраф і г. д.); пры некаторых дробных правапарушэньнях ужываць да правапарушнікаў замест мер сацыяльнае абароны судова-напраўнага характару, меры маральнага і грамадзкага ўплыву, дзеля чаго даручыць НКЮ ў найхутчэйшы тэрмін арганізаваць таварыскія суды; для паглыбленьня напраўна-працоўнага ўплыву на зьняволеных даручыць НКУС павялічыць арганізацыю працоўных частак спраўдамоў у напрамку зьтворчасьці прадукцыі масавага запатрабаваньня; даручыць НКУС разам з НКАсьветы прыняць меры да палепшаньня культурна-асьветнае працы сярод зьняволеных; даручыць НКЮ і НКУС правесьці шэраг мерапрыемстваў з мэтаю больш правільнай пастаноўкі выкананьня судовых прыгавораў; даручыць НКЮ і НКУС узмацніць сувязь з беларускімі навучальнымі ўстановамі (Акадэмія Навук, БДУ і інш.) у мэтах сталага, паглыбленага, навукова-дасьледчага вывучэньня праблем злачынасьці.

Пытаньні судова-крымінальнай палітыкі павінны быць папулярызаваны сярод шырокіх колаў рабочых і сялян шляхам дакладаў на фабрыках, заводах і асабліва на сходах сялян, а таксама праз друк.

АБ ПРАЦЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЯРБОВАЧНАЙ КАМІСІІ ПРЫ ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад тав. Сташэўскага аб дзейнасьці Цэнтральнай Вярбовачнай Камісіі па ўкамплектаваньні вайсковых школ каманднага састава.

Прэзыдыум ЦВК прыняў да ведама даклад тав. Сташэўскага.

Працу Цэнтральнай Вярбовачнай Камісіі пастаноўлена лічыць скончанай.

АБ УЗМАЦНЕНЬНІ ДЗЕЙНАСЬЦІ РАЙЁННЫХ, СЕЛЬСКІХ І МЕСТАЧКОВЫХ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў на імя акруговых і райённых выканаўчых камітэтаў цыркуляр аб узмацненьні дзейнасьці райённых, сельскіх і местачковых рэвізійных камісій.

Прэзыдыум ЦВК, адзначыўшы тую вялікую ролю, якія набываюць рэвізійныя камісіі з пашырэньнем іх праў, ростам мясцовай гаспадаркі і павялічэньнем колькасьці сельскіх бюджэтаў,—прапанаваў выканаўчым камітэтам ужыць неабходныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі: папярэдняе абмеркаваньне выбаршчыкамі кандыдатур у рэвізійныя камісіі, азнаямленьне выбаршчыкаў з задачамі і мэтамі рэвізійных камісій, абавязковую справаздачнасьць райённых рэвізійных камісій на райвыездах саветаў і справаздачнасьць сельскіх і местачковых саветаў на правядзіўчых сходах; дапамогу рэвізійным камісіям у іх працы і інструктаваньне іх з боку вышэйстаячых выканаўчых камітэтаў; шчыльную сувязь рэвізійных камісій з органамі фінансавага кантролю.

ПРА САМААБКЛАДАНЬНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА.

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра вымену пастановы ЦВК і СНК БССР «пра самаабкладаньне насельніцтва». Згодна гэтай пастановы, уносяцца некаторыя папраўкі ў існаваўшы дагэтуль парадак вылічэньня сум самаабкладаньня і іх увысканьня.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

5000 руб. на ліквідацыю няпісьменнасьці.

Гомель, 9-XI. У акрузе налічваецца 96 тысяч няпісьменных ва ўзросьце да 35 год. Ня гледзячы на гэтую колькасьць няпісьменных, работа на ліквідацыі няпісьменнасьці разгортваецца слаба.

Месячнік „За грамату" асаблівых вынікаў ня даў. Цэлы шэраг райёнаў спаборнічаюць адзін з другім у адносіне адсталасьці, спазьненьня, бязьдзейнасьці і г. д. Асабліва адрозьніваюцца Рэчыцкі, Церахоўскі, Буда-Кашалёўскі і Чачэрскі раёны.

Акруговы камітэт партыі прыняў шэраг мер па ажыўленьню гэтай работы. Акругком прапанаваў месцам зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць работы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Прызнана неабходным адлічыць 5000 руб. з пазыкі індустрыялізацыі, распаўсюджанай у вёсцы, для скарыстаньня іх на ліквідацыю няпісьменнасьці.

Будуем агнятрывалыя дамы.

Вабруйск, 2-11. За дзяржаўныя сродкі на працягу апошняга году на Вабруйшчыне збудаваны наступныя агнятрывалыя будынкі: у Глускім раёне ветэрынарная лячэбніца з трыма дапаможнымі к ёй будынкамі і будынак пад 2-хкамплектовую школу; па Чырвона-Слабодзкаму раёну такая-ж ветэрынарная лячэбніца і грамадзкая лазьня; па Парыцкаму раёну—будынак пад 2-хкамплектавую школу; па Жлобінскаму раёну—дом для аграпункту з 2 дапаможнымі будынкамі і лазьня ў вёсцы Праскурні.

У Рагачэўскім раёне па дзяржаўныя сродкі пабудован будынак пад школу і ў Слуцкім раёне адна лазьня.

Зьбіраем мэталёвы лом.

ГОМЕЛЬ, 9-XI. У акрузе пачынаецца ўзмоцненая праца па збору жалезнага лому. Абвяшчаецца тыдзень збору жалезнага лому. Уся праца па збору жалезнага лому будзе праходзіць под кіраўніцтвам камісій, арганізаваных пры кожным райённым камітэце камсамолу.

На буйных прадпрыемствах: «Везувій», «Днепр», «Пролетарий», „Двигатель Революции", на чыгунцы ствараюцца тройкі па садзейнічаньню збору лому. У Гомелі будзе арганізавана акруговая камісія садзейнічаньня збору мэталёвага лому ў складзе прадстаўнікоў: аддзяленьня Рудмэтальгандлю, саюзу мэталёўцаў, аддзелу мясцовай прамысловасьці і інш. арганізацый. Для збору лому ў вёсцы прыцягваецца нізавая каапэрацыйная сетка.

Замест сінагогі і папоўскага дому—школы.

ВОРША, 5-XI. Грамадзяне мястэчка Круча, Круглянскага раёну, на агульным сходзе пастанавілі аб зачыненьні сінагогі і пераводзе ў гэты будынак 7-хгодкі. Супроць гэтай пастановы з агульнай колькасьці грамадзян мястэчка выступіла толькі трое вядомых спекулянтаў, якім сінагога патрэбна па «практычна-карысных неабходнасьцях».

Сяляне вёскі Буда, таго-ж раёну, таксама на сходзе пастанавілі папоўскі дом прыстасаваць пад пачатковую школу.

Рэвізійныя камісіі ў справе выкананьня бюджэту.

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта).

Дзяржфінкантроль, правёўшы рэвізію выкананьня райённага бюджэту па ўсіх райёнах акругі, вызваў, што ніводная з рэвізійных камісій райвыканкомаў нічога не зрабіла ў частцы рэвізіі выкананьня райённага бюджэту.

Тыя рэвізійныя камісіі, якія вызвалі некаторую прапаздольнасьць (Камарынская, Хойнікская і Брагінская) ня могуць пахваліцца вялікімі дасягненьнямі, бо праца іх складалася з праверкі гатоўкі касы і спраў, а ўся фінансавая, гаспадарчая дзейнасьць выканкому засталася не праверанай грамадзкім кантролем. Між тым, пры актыўным удзеле рэвкамісій можна было своечасова ліквідаваць шэраг недахопаў. Выканкомы карысталіся вялікімі сродкамі і разгортвалі вялікую гаспадарчую працу. Апроч таго, амаль ва ўсіх райёнах акругі ўведзены сельскія бюджэты.

Толькі адна гомельская райённая рэвізійная камісія аказалася прапаздольнай. Рэвкамісія ў працягу году некалькі разоў праводзіла рэвізіі паасобных устаноў райёну і выявіла шэраг ненармальнасьцяў у працы райённых устаноў.

Праверка выявіла, што рэвкамісіі не зьбіраліся нават для абмеркаваньня мэты рэвкамісій і пляну намеркаванай да правядзеньня працы, ня гледзячы на тое, што па кантрасьцу кожнага райвыканкому меліся пэўныя сумы на разьезды рэвкамісій.

Асноўнай прычынай непрацаздольнасьці рэвізійных камісій трэба лічыць адсутнасьць усякай увагі да іх з боку райвыканкомаў, якія ні ў пачатку пасьля выбараў рэвкамісій, ні ў працэсе іх існаваньня ня склікалі членаў камісій, не раставлялі ім задач, ня ўнягвалі іх у актыўную працу, не запрашалі членаў рэвкамісій на пасяджэньні прэзыдыумаў і пленумаў райвыканкомаў, каб яны ведалі як працуе райвыканком. У некаторых райвыканкомах бывалі выпадкі, калі РВК не даваў мана для выканаўчых ня райён; Брагінскі райвыканком скарыстаў сродкі на каманды-роўкі, асигнаваныя сумы па райбюджэту на аплату выдаткаў рэвкамісій. Апроч таго, інструктарскі апарат акрвыканкому, выяджаючы на райён для інструктаваньня райвыканкомаў, не займаўся праверкай дзейнасьці рэвкамісій і ня інструктаваў іх. У выніку такой пастаноўкі працы рэвкамісіі не дасягнулі мэты грамадзка-масавага кантролю выкананьня нізавога бюджэту.

Зараз, калі ў акрузе 34 сельсаветы пераведзены на самастойны бюджэт, трэба лічыць асабліва недапушчальнай бязьдзейнасьць рэвкамісій у будучым годзе. Неабходна рашуча дабіцца пералому ў адносінах да органаў савецкай грамадзкасьці й пералому ў працы саміх рэвкамісій. Апошнія павінны заняць сваё месца сярод савецкіх органаў вёскі.

Для ажыўленьня іх дзейнасьці трэба ў сувязі з вядыходзячымі перавыбарамі арганізаваць шырокую справаздачнасьць рэвкамісій. На справаздачных і перавыбарчых сходах сельсаветаў і райённых зьездах саветаў рэвкамісіі прадставілі-б поўную справаздачу іх дзейнасьці па рэвізіі выкананьня бюджэту, а ў сельсаветах скарыстаньня сум самаабкладаньня.

В.

Гомель.

Да пабудовы трамваю ў Гомелі.

Гомель, 1-XI. У Гомелі рыхтуюцца да пабудовы трамваю. У сувязі з гэтым, прэзыдыум акрвыканкому ўзьняў хадайніцтва аб пашырэньні маста на лініі Гомель—Нова-Беліца.

Для абгаварэньня гэтага пытаньня ў Гомель прыехаў прадстаўнік шляховае гаспадаркі БССР.

Фільм „Кастусь Каліноўскі" карыстаецца посьпехам.

Мазыр, 9-XI. Кіно-карціна «Кастусь Каліноўскі» ў Мазыры ішла 4 дні па 3 сэансы. Увесь час каля кіно тэатру былі даўжэзныя чаргі за білетамі.

Ніводная кіно-карціна не праходзіла ў Мазыры з такім посьпехам, як «Кастусь Каліноўскі».

Пагроза голаду ў Заходняй Беларусі.

Ад некаторага часу польскія пераважна віленскія газэты поўны артыкулаў, заметкамі і інтэрв'ю з рознымі кампэтэнтнымі асобамі аб катастрофе неўраджаю ў Віленшчыне і Навагрудчыне.

Неўраджай на абшарах Заходняй Беларусі зрабіўся, можна сказаць, сталым зьявішчам у працягу апошніх гадоў. У мінулым годзе неўраджай на абшарах Віленшчыны быў ужо пагражаючым, цяпер ён стаў катастрафічным і трэба ўжо цяпер вельмі салідная дапамога з боку польскага ўраду, каб і ў будучым годзе ня здарылася новая катастрофа неўраджаю.

Польскія газэты тлумачаць, што прычынай неўраджаю гэтага году зьяўляецца дрэннае надвор'е: дажджы, халады і нават марозы. Так-то яно так, ды ня вусім. Ня трэба ні халадоў з дажджамі і марозаў, каб зьбяднелая пасьля бясконцых войнаў худасочная гаспадарка Зах. Беларусі, не падтрыманая матар'яльна польскім урадам, мусрастала радзіць. Ад самага пачатку пасяленьня абшарамі Заходняй Беларусі панская Польшча толькі ведала, што спаганяць непасільныя падаткі з беларускіх сялян і работнікаў, вывозіць з тэрыторыі Зах. Беларусі лес, лён і іншыя рэчы і не ўкладаць у яе гаспадарку амаль ні граша. На адбудову сялянскай гаспадаркі ў Зах. Беларусі, вусім зруйнаванай вайной польскі ўрад адпускаў самыя мізэрныя сродкі, ды і тыя ў большай сваёй частцы пападалі ў рукі небеларускія. Нават па такія беларускія гаспадарскі, якія былі зьнішчаны дашчэнту, так што по засталося нават хат і халодных будынкаў, польскі ўрад не даваў нічога і беларускі селянін прымушан быў адбудавацца сваімі ўласнымі сіламі. І цяпер яшчэ ў Зах. Беларусі шмат такіх сялянскіх гаспадарак, якія ня маюць хат і ўсіх патрэбных будоўляў. Тысячы сем'яў жывуць яшчэ ў зямлянках. Няма дзе схаваць сабранае з палёў збожжа. Але панскаму польскаму ўраду няма да гэтага ніякага дзела. Затое, калі трэба сьцягнуць падаткі, дык тады зьдзярэць апошнюю сарочку, а падаткі зышчуць. Пры такіх адносінах польскага ўраду да спраў адбудовы беларускай гаспадаркі ня трэба і халадоў з дажджамі і марозаў, каб занядбаная гаспадарка перастала даваць ураджай і перад вачыма паўстала пагроза голаду. Дажджы і халады толькі прысьпяшылі катастрофу, толькі яшчэ больш пагоршылі і да таго дрэнны стан сялянскай гаспадаркі ў Зах. Беларусі. І бяз іх гаспадарка гэтая, якую толькі ведалі, што смактаць, нічога не даючы з свайго боку, хуткім тэмпам набліжалася да катастрофы. Тое самае трэба сказаць і пра гарады «ўсходніх крэсаў», г. ё. Зах. Беларусі. І тут гаспадарчае жыцьцё не разьвіваецца, а прыходзіць усё ў большы ўпадак, як гэта сьцьвярджае «Кур'ер Вілонскі» (№ 248). Разьвіцьцё гаспадарчага жыцьця гораду знаходзіцца ў цеснай сувязі і залежнасьці ад гаспадарчага жыцьця акаляючай яго вёскі і ўпадак гарадоў Зах. Беларусі сьведчыць аб упадку вёскі, упадку, які наступіў не ад халадоў і дажджоў, а ад сьвядомай палітыкі польскіх урадаў, якія на «крэсы» глядзелі толькі з боку чыста фіскальнага.

Цяпер панская Польш[illegible] шыцца выніка[illegible]

«У гарадох нашага краю (Віленшчыны)—піша «Кур'ер Віл.»—з даўняга часу можна заўважыць прыкры ўпадак і так слабой мясцовай прамысловасьці і гандлю. Абмылкай было-б зачыніць вочы на факт упадку Вільні, як цэнтра гаспадарчага жыцьця краю... У параўнаньні з размахам гаспадарчага разьвіцьця цэнтральных і заходніх частак Польшчы, Вільня і Віленшчына стаяць на месцы, калі нават ня ідуць назад... Вільня зьяўляецца адным з найбольшых гарадоў у Польшчы, дзе няма ніякага будаўлянага руху, дзе гандлёвыя памяшканьні пустуюць і крамы зьмяншаюцца і па колькасьці і па якасьці»...

Вось вынікі гаспадараньня панскай Польшчы ў Зах. Беларусі: упадак гаспадарчага жыцьця гарадоў і асабліва вёскі. Неўраджай мае для гэтага ўпадку эпізадычнае значэньне, як лішняя капля вады, якая перапоўніла чашу гаротнага жыцьця Заходняй Беларусі пад уладаю панскай Польшчы.

* * *

Мы ўжо казалі, што справай неўраджаю асабліва зацікавілася абшарніцкая газэта «Слово». Там мы знаходзім вычэрпываючы матар'ял аб неўраджаі. Між іншым, у № 251 «Слова» зьмешчана інтэрв'ю з старшынёю „Віленскага Зямельнага Таварыства" п. К. Вагнэрам, які трымаецца таго зданьня, што сітуацыя, якая ўтварылася ў сувязі з неўраджаем, зьяўляецца вельмі сур'ёзнаю і вымагае [illegible]кіх высілкаў ураданых [illegible] і грамадзянства.

Катастрофа неўраджаю,—кажа п. [illegible]эр,—закранула мясцовасьці, якія [illegible]дзяцца на поўнач ад Вільні; гэта паветы: Браслаўскі, Дзісьненскі, Пастаўскі, Сьвянцянскі, Віленскі і частка Маладэчынскі. Азіміну пасеялі позна, апрача таго, вялікая колькасьць сьнегу і маразы зрабілі тое, што пасевы выпары

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

ЗЕМЛЯУПАРАДКАВАНЬНЕ ДА XI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

Усім добра вядома, што астаткі фэадалізму і прыгону на вёсцы ў нас захаваліся аж да Кастрычнікавай рэвалюцыі. Толькі Кастрычнікавая рэвалюцыя грунтоўным чынам магла вырашыць зямельнае пытаньне на вёсцы даўны зямлю працоўнаму сялянству бяз усялякіх выкупаў і аплаты. Калі мы прагледзім зямельную палітыку па ўсіх капіталістычных краінах, дык мы ўбачым, што відзе гэтае пытаньне так грунтоўна ня вырашана, як у нас, у СССР, і ў прыватнасьці ў БССР; нізе няма такой магчымасьці разгортаньня вытворчых сіл сельскай гаспадаркі; нідзе ня зроблена так, каб зямля зьяўлялася толькі сродкам вытворчасьці, а ня сродкамі падняволеньня беднаты.

Калі мы зьвернемся да нашых бліжэйшых суседзяў, напрыклад да Польшчы, дык мы ўбачым, што сялянства там знаходзіцца ў той самай кабале, у якой яно было і пры царскай уладзе. Усе тыя абяцанкі, які даваў польскі ўрад, яго выкананы. Зямельная рэформа там зьяўляецца яшчэ і па гэты час пытаньнем спрэчным у тым напрамку, што ці трэба ёе праводзіць ці ня трэба. Адзінае, да чаго мог дахадзіцца сучасны польскі ўрад—гэта на пад мяжой з СССР насадзіць асадзікаў, якія складаюцца галоўным чынам з афіцэраў польскай арміі. Сялянства-ж у Польшчы зямлі не атрымала і не атрымае.

Толькі дзякуючы Кастрычніку, мы можам разгарнуць на вёсцы зямляўпарадкаваньне, якое зьяўляецца першачарговым мерапрыёмствам па ўрэдыму рацыянальнай вытворчасьці ў сялянскай гаспадарцы і яе перабудове на сацыялістычных падставах.

Шляхі і мэтады працы, у параўданьні з дарэвалюцыйным зямляўпарадкаваньнем, у нас зусім інакшыя. Старое дарэвалюцыйнае зямляўпарадкаваньне мела сваёй мэтай стварэньне такіх умоў і форм землякарыстаньня на вёсцы, якія навіны былі спрыяць капіталістычнаму разьвіцьцю, г. зн. вулаку, у асобе якога царскі ўрад шукаў падтрымку на вёсцы пасьля рэвалюцыі 1905 г.

Ня гледзячы на дармовую перадачу сялянам у першыя гады пасьля Кастрычніка каля 1.500.000 гэктараў зямлі, усё-ж частка гаспадарак ня была надзелена зямлёй, каб здаволіць спажывецкія патрэбы сялян. Савецкая ўлада выдзеліла для гэтай мэты з іншых зямель яшчэ 405.429 гэктараў, што дало магчымасьць пры зямляўпарадкаваньні надзяліць і дзнадзяліць 90.107 гаспадарак. Адсюль відаць, што зямляўпарадкаваньне пры савецкай уладзе адыгрывае ня толькі палітычную ролю, але адначасова зьяўляецца самым вялікім фактарам гаспадарчага ўздыму.

Падводзячы вынікі, што зроблена ў галіне зямляўпарадкаваньня да XI гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў БССР, трэба адзначыць, што са ўсяе зямельнае плошчы ў працоўным сялянскім карыстаньні знаходзіцца каля 85 проц. і толькі 15 проц. усяе тэрыторыі Беларусі складаюць зусім няўжытковыя землі, лясы дзяржаўнага фонду, землі, якія знаходзяцца пад дарогамі, вадаёмамі, населішчамі, гарадамі і дзяржаўнай зямельнай маемасьцю.

Да XI гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ўсяго зямляўпарадкавана каля 44 проц. зямель, якія знаходзяцца ў працоўным землякарыстаньні; закончыцца зямляўпарадкаваньне на плянавых меркаваньнях да 1934 г.

Растуць таксама і сродкі, якія адпускае дзяржава на зямляўпарадкаваньне; бядняцка-серадняцкія двары аслабаняюцца ад платы за зямляўпарадкаваньне, 35 проц. ад агульнай колькасьці гаспадарак зямляўпарадкавана за кошт дзяржавы.

У 1925-26 годзе ўлада адпусьціла на зямляўпарадкаваньне 756.000 руб., у 1926-27 г. 1058000 руб., а ў 1927-28 г.—2100100 руб., з якіх доўгатэрміновага крэдыту 500.000 руб.

Значным дасягненьнем зьяўляецца таксама надзяленьне зямлёй яўрэйскага насельніцтва, якое па законах царскага ўраду не магло карыстацца зямлёй.

Да XI гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі мы маем 9013 яўрэйскіх сем'яў—47.797 душ, якія перайшлі на сельскую гаспадарку, атрымаўшы зямлю ў межах БССР, з іх 2185 сямей аб'яднаны ў калгасы на плошчы 21.500 гэкт.

У бягучым 1928 годзе прыступлена да гаспадарчага ўпарадкаваньня 9 мястэчак. Апроч гэтага, у Гомельскай, Мазырскай і Бабруйскай акругах выяўлены значныя балотныя плошчы для яўрэйскага насельніцтва, на якіх зараз праводзяцца гідратэхнічныя і культуртэхнічныя работы.

Вашчылла—Вірын.

ПРАЗ АСУШКУ БАЛОТ ЗАВАЮЕМ НОВУЮ УРАДЖАЙНУЮ ГЛЕБУ, ЗДАБУДЗЕМ ТАННЫ АПАЛ—ТОРФ.

На балоце заквітнеюць нівы

Песачанскае мэліярацыйнае таварыства (Капыльскі раён, Меншчына) арганізавалася ў 1925 годзе з лікам звыш 300 сяброў. У 1926 годзе таварыства пачало асушваць балота „Пад'возера".

На памянёным балоце было шырокае возера.

Кажуць, што гэтае возера ня мелада і ўтварылася яно ад таго, што калісьці там стаяла м-ка Пясочна, Пясочна „утанула" і ў выніку ўтварылася такое бяздоньне.

Шмат наконт гэтага возера ходзіць лягенд. Паколькі яны цікавыя, я прывяду некаторыя з іх.

— Аднаго разу, калі быў прыгожы сонечны дзень, на возеры «зявіліся» царскія дзьверы з царквы.—Нехта хацеў памераць вяроўкаю глыбіню гэтага возера, але з дна адказала: «ня мерай вяроўкаю, а галавою», тады «цікавы» спужаўся і пакінуў мераць.

Шмат яшчэ якіх пагаворак маецца; усе яны набылі забабонны характар і стварылі ў насельніцтва думку, што да гэтага возера з балотам ніяк не дасьтупішся шляхам «пейкіх мэліярацыяў». А зрабіць у такім месцы асушку было-б выгада.

Папершае, насельніцтва ўбачыла-б, што на сьвеце нічога няма «не дасяжнага нашаму розуму», падругое—ня гравла-б кожны год жывёла, як гэта назірацца ніпер і патрацае—замест цяперашняй пустачы насельніцтва атрымала-б шмат карыснай зямлі.

У 1926 годзе для адзначэньня месца па капаньню канаў былі выстаўлены тычкі. Пасьля некаторага часу гэтыя тычкі пастухамі былі павырываны і спалены ў вогнішчы. Гэта таму, што выехаў каморэйк і ня прыехаў аж дагэтуль; а тым часам насельніцтва страціла ўсю надзею на працягваньне пачатай працы.

Самі сяляне таксама не пахаджаўчалі, каб выпісаць мініяратара. Словам ня было штурхача, які-б паварушыў гэту справу. Праўленьне таварыства зусім непрацаздольнае, ды апрача гэтага не хацела бясплатна працаваць, патрабавала грошай. Такім чынам справа вышчэньня некарыснага балота прыйшла ў мёртвы стан.

Апрача ўсяго гэтага, значна перашкаджае працы створаная заможнікамі думка, што калі асушыць «Пад'возера», дык тады ўлада забярэ яго пад торфа-распрацоўкі і самім сялянам карысьці ня будзе ні на грош.

Праз такія «прычыны» такая каштоўная справа хварэе. Партыйная і камсамольская ячэйкі разам з усімі грамадзкімі арганізацыямі павінны даць належны адпор кулакам і створаныя ўмовы для працы выкарыстаць. Трэба знайсьці такога чалавека, які-б аддаўся гэтай працы і тады на балоце заквітнеюць нівы.

Пры гэтым хачу адзначыць, каб раённае мэліярацыйнае кіраўніцтва дало хоць маленькую грашовую дапамогу тым адзінкам, якія патрацяць на гэта пэўны час. Трэба стварыць добрую грамадзкую думку супроць кулацкае хлусьні, растлумачыўшы беднаце, што асушаная зямля пойдзе на карысьць бяднякам і сераднякам.

М. Варанецкі.

Як ідзе мэліярацыя.

(Ветрынскі раён, Поляччына).

Па раёну арганізавана 22 мэліярацыйныя таварыствы, якія разгарнулі вялікую працу па Нацкіх балотах.

Калі прыглядзецца да іх працы, дык мы маем два розныя становішчы.

Першая частка: дзякуючы працы агранома, нагляду з боку РВК, штогоднага крэдыту таварыствам значна палепшылі сваю працу. У Кабакоўскім і Гімрацкім таварыствах, ужо пачаліся засевы, працуе трактар і інш.

Другая частка: у таварыствах праца кульгае амаль што на дзьве нагі.

У чым-жа справа, хто вінаваты? У першай частцы ёсьць сапраўдная беднота, якая сама зацікаўлена працай і пры дапамозе дзяржавы мае добрыя вынікі.

Другая частка, куды залезьлі заможныя сяляне, мае шмат зямлі, але працуе пад відам «бедняка». Такіх прыкладаў па раёну ёсьць шмат.

Трэба належным установам задумацца над пытаньнем аб існаваньні некаторых мэліярацыйных таварыстваў.

Янка.

ТОРФ НА ЗЬМЕНУ ЛЕСУ.

(Ліст з Бабруйску).

Па самых точных падліках забесьпячэньне Бабруйшчыны драваным апалам у сучасны момант дасягае толькі 67 проц. агульнай патрэбы. Такім чынам само на сабе вынікае пытаньне аб замене гэтай недастаючай часткі апалу якім небудзь матар'ялам. Гэтым матар'ялам і зьяўляецца торф.

Па папярэдніх меркаваньнях запасу торфу на Бабруйшчыне хопіць ня менш, як на дзьвесьці гадоў. Але ня гледзячы на такія запасы торфу і недахват апалу распрацоўка торфу на акрузе да гэтага часу ідзе пакуль што марудна. Так у 1924-25 годзе было на Бабруйшчыне здабыта толькі 4500 кубічных мэтраў торфу, у 1926-27 годзе 16140 кубічных мэтраў. На працягу апошняга году выпрацоўка торфу павялічылася ў два разы супроць мінулага году, але ўсё-ж гэта нельга прызнаць здавальняючым, бо торф распрацоўваўся толькі 19 тарфянымі таварыствамі 6, савгаспадаркамі і 2 прадпрыёмствамі.

Прычына слабае наладжанасьці працы па торфарасрацоўках крыецца ў тым, што на гэты „тавар" няма збыту. Гэта заглушае канчаткова справу распрацоўкі балот на торф, гэта спрыяе бязьлітаснаму зьнішчэньню нашых лясоў.

Чому-ж няма збыту на торф? А таму, што нашы прадпрыёмствы, адчуваючы відавочны недахват дравянога апалу, ня турбуючыся працягваюць яго скарыстоўваць. Праўда, у гэтым напрамку добрую справу зрабілі некалькі прадпрыёмстваў акругі, 6 савецкіх гаспадарак перайшоўшы на тарфяны апал. Перайшлі на тарфяны апал вёскі Елкі і Лукі.

Усё-ж гэта зьяўляецца пакуль што каплею ў моры ў справе скарыстаньня торфу, як апалу. А між тым на акрузе ў самы хуткі час можна перавесьці на тарфяны апал 27 буйных прадпрыёмстваў. Сюды належаць бровары, электрастанцыі, цагельныя заводы, млыны і іншыя заводы і прадпрыёмствы. Для гэтых прадпрыёмстваў штогодна патрэбна 135 тысяч кубічных мэтраў апалу. Трэба ўявіць сабе, сколькі-б лесу было захавана пры пераводзе ўсіх гэтых прадпрыёмстваў на тарфяны апал! А колькі-б эканоміі атрымалася ў сродках пры тарфяным апале; калі кубічны мэтр дравянога апалу каштуе 10 р. 50 к. у сярэднім, а кубамэтр торфу толькі 6 руб. 75 кап.? **Гэтая эканомія была-б роўна ні меней ні болей, як 570 тысяч р. ў год.** Лічба салідная і аб ёй трэба было-б падумаць.

Бязумоўна, што пераход прадпрыёмстваў на тарфяны апал паслужыў бы, папершае, прыкладам вакольнаму сялянству ў справе скарыстаньня торфу і, падругое—паслабіў бы недахват дравянога апалу. Аб гэтым трэба падумаць каму належыць і ў хуткім часе прыпяцца за скарыстоўваньне торфу.

Торф павінен прыйсьці на зьмену дрывам і каменнаму вугалю.

А. Дамброўскі.

Вёска машынізуецца.

Бабруйск, 9-11. За апошні год сялянства Бабруйшчыны прад'явіла вялікі попыт на сельска-гаспадарчыя машыны.

Так, заместа прададзеных у 1927 г. 2338 плугоў, 607 барон, 564 акучнікаў, 17 сеялак, 580 веялак, 12 сартыровак, у 1928 годзе плугоў прададзена 4715, барон 1551, акучнікаў 819, сеялак 42, веялак 703 і сартыровак 53.

Пакупка малатарняў таксама ўзрасла за апошні год на 100 проц.

Пэрспэктывы крэдытаваньня жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва.

На жыльлёвае будаўніцтва мяркуецца адпусьціць 5.906.000 руб.—На камунальнае—3.100.000 руб.

БУДЗЕ ПАБУДАВАНА 140.000 КВ. МЭТР. ЖЫЛЬЛЁВАЙ ПЛОШЧЫ.

План крэдытаваньня жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва на 1928-29 год у сучасны момант разглядаецца цэнтральнымі органамі Саюзу.

Водлуг пляну, на жыльлёвае будаўніцтва БССР прадугледжана адпусьціць крэдыт у разьмеры 5.906.000 руб. У параўнаньні з леташнім годам плян фінансаваньня жыльлёвага будаўніцтва ў 1928-29 годзе дае павялічэньне на 1.600.000 руб.

Найбольшая колькасьць сродкаў вызначана на жыльлёвае будаўніцтва акруговых выканаўчых камітэтаў—1.800.000 руб., больш леташняга на 29 проц.; рабочай жыльлёва-будаўнічай каапэрацыі 1.621.000 руб.; на жыльлёвае будаўніцтва на транспарце—1.000.000 руб., на жылбудаўніцтва рэспубліканскай прамысловасьці—645.000 руб.; Жактам—200.000 руб.; на скончэньне жыльлёвага будаўніцтва на „Асінстрой"—200.000 руб. і індывідуальным забудоўшчыкам—140.000 руб.

З больш цікавых пабудоў трэба адзначыць пабудову ў Менску дому на 100 кватэр, які мяркуецца пабудаваць у працягу 2 гадоў.

Наогул-жа па ўсіх відах жыльлёвага будаўніцтва ў 1928-29 годзе водлуг кантрольных лічбаў Дзяржпляну БССР мяркуецца затраціць 22.146.000 руб. Апрача банкаўскага крэдыту будаўніцтва будзе весьціся за рахунак прамысловасьці, дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў, уласных сродкаў і фондаў рабочага будаўніцтва. За ўсе гэтыя сродкі мяркуецца пабудаваць 140.000 кв. мэтраў жыльлёвай плошчы.

ПАШЫРЫЦЦА І КАМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

У галіне камунальнай гаспадаркі крэдыты будуць адпушчаны на электрыфікацыю, трамвай, каналізацыю і водаправод. Усяго на гэту мэту мяркуецца адпусьціць 3.100.000 руб. банкаўскага крэдыту. З гэтай сумы на пабудову менскага трамваю будзе адпушчана 900.000 руб. і на каналізацыю 750.000 руб. Мяркуецца распачаць пабудову водаправоду ў Полацку, скончыць будаўніцтва бабруйскага водаправоду, даабсталяваць гомельскі, працягваць будаўніцтва аршанскага і ўзмацніць менскі водаправод. Усяго на будаўніцтва водаправодаў будзе затрачана 615.000 руб.

З агульнай сумы на электрыфікацыю мяркуецца адпусьціць 835.000 руб., з якіх Менску і Барысаву вызначана 276.000 р., Гомелю—150.000 руб., Бабруйску—124.000 руб., Магілеву—129.000 руб. і Воршы для Горак—100.000 руб. За гэтыя сродкі будуць будавацца новыя электрастанцыі, дабудоўвацца тыя, якія пачалі будавацца сёлета і, урэшце пераабсталёўвацца і даабсталёўвацца існуючыя электрастанцыі.

Упяршыню ў крэдытным пляне прадугледжана культурна-бытавое будаўніцтва: будзе фінансавацца пабудова клюбаў, лазьняў і сталовых грамадзкага харчаваньня. На ўсе гэтыя патрэбы ў пляне вызначана 430.000 руб.

На будаўніцтва прамысловасьці мясцовага значэньня ў 1928-29 годзе мяркуецца адпусьціць 785.000 руб. У гэтай суме прадугледжаны сродкі на пабудову і даабсталяваньне майстэрняў пры дворах. У галіне мясцовай прамысловасьці мяркуецца пабудаваць і даабсталяваць шэраг цагляных заводаў, на што будзе адпушчана 315.000 руб., а рэшта сродкаў вызначана на пабудову лесазаводаў, тарфяных, механічных, смалакураных і шэрагу іншых заводаў.

Такім чынам агульная сума банкаўскага крэдыту на пералічаныя віды будаўніцтва складае досыць буйную суму ў 10.221.000 руб. Летась-жа было адпушчана ўсяго 6.397.000 руб.

Беларускі Камунальны Банк ужо распачаў авансіраваньне асноўных арганізацый жыльлёвага будаўніцтва на загатоўку будаўнічых матар'ялаў. Гэта мерапрыёмства своечасова забясьпечыць нашы будуючыя арганізацыі і тым самым дасьць магчымасьць своечасова пачаць будаўнічы сэзон. На жаль забясьпечаньне будаўніцтва дэфіцытнымі будаўнічымі матар'яламі ня будзе цэнтралізавана (цэмант, жалеза і інш.), а нам здавалася-б, што цэнтралізаванае забясьпечаньне гэтымі будаўнічымі матар'яламі праз Камунальны банк мэтавугодна і павінна было-б адбіцца на зьніжэньні кошту самога будаўніцтва.

Зьніжэньне выдаткаў іх ня тычыцца

Ня толькі сярніковы трэст Беларусі, але ўсе трасты ўжо давялі цьвёрда памятаюць дырэктыву аб 20 процантным зьніжэньні адміністрацыйна-управленцкіх выдаткаў. Ад гэтуль відаць што сярніковы трэст складаў свой кашторыс на 1928-29 год зусім пры цьвёрдай памяці.

Нічога ня кажучы аб якіх-небудзь іншых выдатках, мы паралічым толькі некаторыя тыя выдаткі, якія вызначыў у кашторысе старанны сярніковы трэст. Вось яны: На камандыроўкі—9.600 р. На паштова-тэлеграфныя расходы—3.900 р. На газэты і літаратуру—600 р. На ўтрыманьне памяшканьня ў чыстаце—895 р.

Далей трэст просіць у кашторыснай камісіі ВСНХБ, інжынэра па эканоміцы працы, адну траціну(?) хранамэтражыста і інш.

Урэшце, ня ў тым справа, чаго трэст просіць. Зразумела, што колькі ні шмат дырэктыў аб зьніжэньні выдаткаў, гаспадарца ўсё роўна ў прасяке кашторысу іх павялічыць; такі ўжо ён на сваёй натуры.

Ёсьць пры ВСНХБ камісія па разгляду кашторысаў, якая сачыць за тым, каб кашторысы ня пухлі. І ў гэтым выпадку камісія паабрэзвала ўзостаўскую пухліну наступным чынам: На камандыроўкі—4.100 руб. На пашт.-тэлегр. расходы—2.500 р. На газэты і літаратуру—200 р. На ўтрыманьне памяшканьня ў чыстаце—240 руб.

Інжынэра па эканоміцы працы і «траціну» хранамэтражыста камісія в кашторысу выкінула зусім.

Такім чынам, пакуль трэст з'эканоміў-бы яшчэ некалі, камісія з'эканоміла адразу звыш 11 тысяч рублёў.

Як у такіх выпадках заўсёды бывае трэст піша ў камісію скаргу, даводзячы, што на камандыроўкі яму трэба ні капейкі менш, як 9.600 руб. і што в паштова-тэлеграфныя расходамі нават за 3.899 руб. трэст нічога ня зробіць.

Трэст мы менш усяго вінавацім.

Але вось паглядзіце, як на гэта рэагавала эканомкамісія трэсту:

> «Экономкомиссия, заслушав возражения треста по поводу „сокращения административно-управленческих расходов на 1928-29 год, конотатирует, что они являются СЛИШКОМ ПРЕДУМЕНШЕННЫМИ И ЯВНО НЕДСТАТОЧНЫМИ»...

Ня маючы на плячох галавы, эканомкамісія прычэпілена навядком да хваста адміністратараў і так за імі і бяжыць.

Эканомкамісія, якой больш чым каму-небудзь другому трэба сачыць за скарачэньнем выдаткаў, пацкованая адміністрацыяй, наіўна цяўкае:

> «...слишком предуменшенными и явно недостаточными»...

Гледзячы толькі на гэтыя дзьве лічбы (камандыроўкі—9.600 руб. і паштова-тэлеграфныя расходы—3.900 руб.), мы бачым як раз адваротнае, **бачым, што яны занадта распухлі і яўна залішнія.**

Яны толькі тады стануць нармальнымі, калі эканомкамісія сярніковага трэсту абража павадок адміністрацыі і будзе думаць галавою.

С. Азерскі.

Маем буйныя дасягненьні.

За адзінаццаць год Савецкай улады ў Аршаншчыне арганізавана 188 калектыўных гаспадарак, 144 мэліярацыйных таварыстваў, на шматпольле пераведзена 14310 сялянскіх гаспадарак; беззямельным і малазямельным раздадзена 24696 гэктараў зямлі.

Замест малакаштоўных культур павялічваецца плошча тэхнічных культур: сёлета засеена канаплі 3707 гэктараў, канюшыны—14956 гэктараў, пад ільном—18807 гэктараў і пад вікай—14211 гэктараў.

На акрузе працуе 14 пракатна-машынных пунктаў з 3226 машынамі. Ачышчанае насеньне складае 25,4 проц. усяго насеўнага матар'ялу.

За ўвесь час зямлеўпарадкавана 45,84 проц. усёй сялянскай зямлі.

Гэтыя дасягненьні сьведчаць аб тым, што вёска Аршаншчыны ідзе сацыялістычным шляхам—да лепшага жыцьця.

Ворша. **Н.**

Сельска-гаспадарчая каапэрацыя да 11-й гадавіны Кастрычніка.

Каб высьветліць становішча і працу с.-г. каапэрацыі, хоць-бы ў асноўным, трэба адказаць на тры асноўныя запытаньні: як праводзілася арганізацыйная дзейнасьць с.-г. каапэрацыі, як ішла гаспадарчая праца і які гаспадарчы і грашовы стан с.-г. каапэрацыі.

Адказваючы на першае запытаньне, трэба мець на ўвазе, што ў пачатку мінулага апэрацыйнага году сыстэма с.-г. каапэрацыі мела каля 20 відаў спэцыяльных аб'яднаньняў першапачатковай сеткі, пагэтаму саюзы с.-г. каапэрацыі былі надзвычайна універсальнымі, і таму к пачатку 1927-28 апэрацыйнага году паўстала пытаньне, каб тыя галіны працы саюзаў с.-г. каапэрацыі, у якіх пізоўка спэцыяльных відаў дастаткова ўзмоцнена як арганізацыйна, так і гаспадарча, выдзеліць з універсальных саюзаў і арганізаваць спэцыяльныя саюзы.

На працягу мінулага апэрацыйнага году намі арганізаваны спэцыяльныя малочна-жывёлагадоўчыя саюзы, хоць яшчэ гэтыя саюзы арганізаваны не ва ўсіх акругах, бо як вышэй сказана, мы лічылі магчымым і неабходным арганізацыю саюзаў праводзіць у тых акругах, дзе ўжо да гэтага мелася эканамічная база і дзе ў дастатковай ступені разгарнула сваю працу пізавая сетка. Такімі акругамі ў мінулым годзе зьяўляліся: Менская, Гомельская, Віцебская і Магілеўская, дзе і арганізаваны акруговыя саюзы малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі.

Намі таксама пачата выдзяленьне з універсальных саюзаў калектыўных гаспадарак; ва ўсіх акруговых саюзах на працягу мінулага году арганізаваны самастойныя саюзы калектыўных гаспадарак, якія на працягу гэтага апэрацыйнага году павінны быць рэарганізаваны ў акруговыя саюзы калектыўных гаспадарак; на 2-м усебеларускім зьезьдзе калектыўных гаспадарак арганізован усебеларускі саюз калгасаў.

У мінулым-жа годзе пачалося выдзяленьне з універсальных саюзаў садова-гароднай каапэрацыі; у Гомельскай акрузе арганізован садова-гародны саюз і садова-гародняя каапэрацыя вылучана з Палессаюзу. Вось тая арганізацыйная праца, якая намі праведзена за мінулы год на другому і трэцяму зьвяну сыстэмы с.-г. каапэрацыі.

Цяпер, калі мы зьвернемся да арганізацыйнай працы самой пізоўкі, дык мы маем наступныя вынікі. На 1 кастрычніка 1927 г. мы мелі ў сыстэме с.-г. каапэрацыі 1273 первічных аб'яднаньняў. На 1 ліпеня мы ўжо мелі 2747 аб'яднаньняў,—прырост на 1474 адзінкі, ці на 115 проц. У паказаныя лічбы ўваходзяць аб'яднаньні, якія зьяўляюцца сябрамі саюзу. Акрамя гэтых аб'яднаньняў, ёсьць яшчэ шмат так званых «дзікіх», якія ня ўцягнуты ў сыстэму с.-г. каапэрацыі.

Калі мы возьмем рост паасобных відаў, дык, галоўным чынам, гэты прырост падае на вытворчыя каапэрацыйныя аб'яднаньні, што і зьяўляецца вельмі пажаданым. Па асобных вытворчых відах рост наступны: калгасы—424 адзінкі, альбо 102 проц., машынныя т-вы—236 альбо 274 проц., мэліярацыйныя т-вы—379, ці 285 пр., малочна-жывёлагадоўчыя т-вы—199 і г. д.

Калі мы возьмем рост каапэраваных сялянскіх гаспадарак, то маем наступныя лічбы: па 1 кастрычніка 1927 г. было каапэравана сыстэмай 285696 сялянскіх гаспадарак, ці 35,87 проц. усіх сялянскіх двароў; на 1 ліпеня 1928 г. каапэравана 369369 сялянскіх гаспадарак, ці 45,7 проц.—павялічэньне на 29,3 проц. Найбольшы тэмп каапэраваньня насельніцтва даюць таксама і вытворчыя віды каапэрацыі.

Разам з гэтым праводзілася спэцыяльная праца па каапэраваньню беднаты, дзеля чаго з розных галін быў складзен фонд каапэраваньня беднаты ў 128000 руб., з якіх на 1 ліпеня 1928 г. скарыстана на каапэраваньне беднаты 112000 руб., прычым каапэравана 26500 сялянскіх гаспадарак.

Каб скончыць з арганізацыйным пытаньнем, нам трэба яшчэ разглядзець, якія групы насельніцтва каапэраваны сельска-гаспадарчай каапэрацыяй. Калі мы возьмем усё каапэраванае насельніцтва ў с.-г. кр. таварыствы і разаб'ём па групах, дык атрымаем, што бядняцкія гаспадаркі складаюць 35,5 проц., серадняцкія—56,2 проц. і заможныя—8,3 проц. Гэтыя лічбы гавораць за тое, што каапэраванае насельніцтва складае ў асноўным бядняцка-серадняцкую частку вёскі.

Калі мы зьвернемся да снабжэньня загатоўчай працы, дык убачым наступнае: у 1926-27 г. гэтыя апэрацыі складалі каля 10.000.000 руб. за ўвесь апэрацыйны год, а ў 1927-28 г. за тры квадры яны складаюць каля 16.000.000 руб. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што ў данай галіне праца с.-г. крэдытных таварыстваў мае значныя дасягненьні. Калі возьмем агульны ўзрост балянсу, то маем наступныя лічбы: на 1 кастрычніка 1927 г. балянс пізоўкі быў 15.385.000 руб., а на 1 ліпеня 1928 г. ён складае 23.817.000 руб.

Якія групы сялянскіх гаспадарак абслугоўвала крэдытная сетка? Тут мы маем наступныя лічбы: група бядняцкая ў крэдытаваньні займае 37,5 проц., серадняцкая 59,8 проц. і заможная 2,7 проц. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што наша пізавая сетка абслугоўвае галоўным чынам бядняцка-серадняцкую частку вёскі.

Цяпер аб гаспадарчай дзейнасьці акруговых саюзаў і Белсельсаюзу. За ўвесь апэрацыйны 1926-27 г. снабжэнчаскіх тавараў было завезена на 8.134.000 руб., а за тры квадры 1927-28 г. прадана на 9.384.000 руб. Па збытавых апэрацыях было прадана тавараў за ўвесь 1926-27 г. на 7.747.000 руб., а за тры квадры 1927-28 г.—на 11.851.000 руб. Як бачым, і тут мы маем вялікія дасягненьні. Калі арыентыровачна абагуліць усе лічбы, дык будзем мець наступны вынік: за ўвесь апэрацыйны 1926-27 г. сыстэма мела тавараварот у 29395 тыс. руб., а за 3 квадры 1927-28 г.—36959,5 т. руб.

У зьвязку з узмацненьнем дзейнасьці і заняцьця большага месца як на рынку, так і ў сельскай гаспадарцы, сыстэма с.-г. каапэрацыі ў гэтым годзе мае і іншыя вынікі. Увесь час свайго існаваньня сыстэма с.-г. каапэрацыі працавала з убыткам, а ў гэтым апэрацыйным годзе яна скончыць сваю працу хоць і не з вялікім, але ўсё-ж такі з прыбыткам. Па пізавой сетцы чысты прыбытак будзе 180.000 руб., а па акрсельсаюзах—169.000 руб.

Прыведзеныя лічбы сьведчаць аб тым, што сыстэма с.-г. каапэрацыі значна пашырыла абслугоўваньне сельскае гаспадаркі, а з другога боку на базе пашырэньня гаспадарчай дзейнасьці палепшыла і сваё грашовае становішча.

Некалькі горш справа абстаіць з мабілізацыяй сродкаў самага каапэраванага насельніцтва, хоць і тут мы маем дасягненьні. Паявыя ўзносы на 1-е кастрычніка 1927 г. складалі 1.060.000 руб., а на 1-е кастрычніка 1928 г. яны складаюць 1.804.000 руб. Наогул, свае капіталы ў пізавой сетцы на 1-е кастрычніка 1927 г. складалі 2.625.000 руб., а на 1-е ліпеня 1928 г. яны складаюць 4.216.000 руб.

Акрсельсаюзы на 1-е кастрычніка 1927 г. сваіх капіталаў мелі 664.000 руб., а на 1-е ліпеня 1928 г. маюць 1.048.000 руб. У акрсельсаюзах і ў балянсе ў процантных суадносінах свае сродкі павялічыліся: на 1-е кастрычніка 1927 г. яны складалі 16 проц., а на 1-е ліпеня 1928 г.—17,5 проц.

Вось, прыблізна, тыя дасягненьні, якія мае сыстэма с.-г. каапэрацыі за 3 квадры 1927-28 апэрацыйнага году.

Але, ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, у нашай працы ёсьць яшчэ вялікія недахопы. Пералічваць іх тут я ня буду, бо яны, бадай, усім вядомы; галоўным зьяўляецца тое, што мы і да гэтага часу не ўцягнулі ў нашу каапэрацыйную працу нашых пайшчыкаў, і дагэтуль яшчэ наглядаецца такое становішча, калі каапэратыў працуе сам па сабе, а пайшчык жыве сам па сабе. Пагэтаму перад намі стаяць задачы: першае, гэта ня зьніжэньне тэмпу гаспадарчай працы, а найбольшае яго падвышэньне, бо ад гэтага залежыць выкананьне тых задач, якія настаўлены камуністычнай партыяй і савецкім урадам перад сыстэмай с.-г. каапэрацыі; другое і самае галоўнае, трэба ў нашу штодзённую каапэрацыйную працу ўцягнуць нашага пайшчыка, бо калі мы апаратным парадкам можам яшчэ як-небудзь працу пашыраць, дык палепшыць нашу працу бяз шырокага ўдзелу ў ёй каапэраванага насельніцтва мы ня зможам. Трэба нашу працу з пайшчыкам ставіць так, каб ён ня толькі ведаў, дзе знаходзіцца праўленьне каапэратыву, ці яго склады, а каб ён ведаў і цесна ўвязваў сваю гаспадарчую дзейнасьць з каапэратывам.

Аксючыц.

Посьпехі прамысловай каапэрацыі

(Ліст ад нашага магілеўскага карэспандэнта).

Ужо ў сучасны момант саюз прамысловай каапэрацыі яднае 119 арцеляў з 1537 членамі. Супроць становішча на 1 кастрычніка мінулага году лічба арцеляў павялічылася на 60 процантаў, а каапэраваных саматужнікаў—на 82 проц.

На першым месцы ідуць шавецка-загатовачныя арцелі, за год лік членаў у іх павялічыўся ў 4 разы і дасягнуў 235 чалавек.

Вельмі вялікае павялічэньне (у 3 з пал. разы) маецца і ў кравецкіх арцелях, дзе працуе 135 чалавек.

Смалакурныя арцелі Магілеўшчыны, яднаючыя 185 членаў, даюць каля паловы ўсёй смалакуранай прадукцыі Беларусі.

Яшчэ хутчэй, чымся рост арцеляў, ішло павялічэньне вытворчасьці іх, якая дасягнула за год 1.790.000 р., на 90 пр. вышэй супроць папярэдняга году.

Мінулы год мае і рад дасягненьняў па нармалізацыі арцеляў, узбуйненьні іх, 6 дробных шавецкіх арцеляў у Магілеве аб'яднаны ў адну, аб'яднаны таксама 9 скорапасадачных арцеляў, кравецкія арцелі. Узбуйненьне арцеляў дало магчымасьць паменшыць арганізацыйныя выдаткі, увесьці разьдзяленьне працы, парганізаваць прадукцыю і палепшыць яе якасьць, а цэны зьніжаны да прэйскурантных цэн Наркамгандлю.

Акруговы саюз прамкаапэрацыі за мінулы год вельмі значна павялічыў свой удзел у гаспадарчай працы арцеляў: па забесьпячэньні да 62 пр. (супроць 19 проц. у папярэднім годзе) і па збыту да 42 проц. (супроць 12).

Акрамя памянёных арцеляў, у акрузе працуюць 15 крэдытна-прамысловых арцеляў, з 3700 членамі; усяго-ж—і таварыствы і арцелі—ахопліваюць каля палавіны ўсіх саматужнікаў акругі, якіх налічваецца ўда 10 з пал. тысяч.

У новым гаспадарчым годзе стаіць адказная задача—каапэраваць вясковага саматужніка. Трэба стварыць новыя арцелі па шчапной вытворчасьці——выпрацоўцы гонту, клёпкі, бочак, абадоў і інш. (створаная гэткая арцель у вёсцы Чачэвічах з посьпехам разгортвае сваю працу), смалакуранай, агнятрывалых матар'ялаў, пераапрацоўцы прадуктаў, садоўніцтва і гароднiцтва.

На існуючай сетцы трэба працягваць працу па мэханізацыі і ўзбуйненьні арцеляў, ісьці на зьніжэньне сабекаштоўнасьці вырабаў, удасканаліць калькуляцыю, узяць курс на рэгуляваньне заработнае платы.

Посьпехі ў прамысловым каапэраваньні ёсьць. І значныя. І надалей маюцца падставы, каб ісьці ўперад. Каб усё больш і ўсё паўней згуртоўваць саматужніка, які ў нашай савецкай краіне павінен працаваць ня сам па сабе, а сумесна, арцельлю, чым ён уцягваецца ў рэчышча нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Квік.

Каапэрацыйных карабейнікаў у вёску!

Не ўва ўсіх яшчэ вёсках Капыльскага раёну маюцца каапэратывы, а ёсьць нават і такія месцы, ад якіх каапэратывы знаходзяцца на адлегласьці 4-5, а то яшчэ і больш вёрст.

Вось гэтым і карыстаюцца прыватныя гандляры, якія яшчэ ў нашым раёне маюцца. Яны разьяжджаюць па вёсках і скупліваюць рознае сыр'ё, як напрыклад: грыбы, яйкі, кудзелю, лён, шчаціну, конскі волас і інш.

За свае-ж тавары яны дзяруць па дзесяць скур, за адну хусьціну, напрыклад, яны бяруць дзесяць хунтаў старызны і г. д.

Трэба супыніць арудаваньне прыватнікаў у вёсках нашага раёну, а дзеля гэтага неабходна, каб кожны тыдзень па тых вёсках, дзе няма ка

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб назначеньні тав. Захаравай, Д. І. Намесьнікам Народнага Камісара Працы БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Захараву, Дору Ісакаўну Намесьнікам Народнага Камісара Працы БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 кастрычніка, 1928 году.
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о назначении тов. Захаровой, Д. И. Заместителем Народного Комиссара Труда БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

Назначить тов. Захарову, Дору Исаковну, Заместителем Народного Комиссара Труда БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

27 октября, 1928 г.,
г. Минск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб аслабаненьні тав. Міленькага, М. І. ад абавязкаў члена бюджэтнай камісіі ЦВК БССР і аб абраньні тав. Сасноўскага, А. М. членам бюджэтнай камісіі ЦВК БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Аслабаніць тав. Міленькага, Марка Ільліча ад абавязкаў члена Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР.

2. Абраць тав. Сасноўскага, Антона Міхайлавіча членам Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 кастрычніка, 1928 году,
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

об освобождении тов. Миленького М. И, от обязанностей члена бюджетной комиссии ЦИК БССР и об избрании тов. Сосновского А. М. членом бюджетной комиссии ЦИК БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

1. Освободить тов. Миленького, Марка Ильича от обязанностей Члена Бюджетной Комиссии ЦИК БССР.

2. Избрать тов. Сосновского, Антона Михайловича, Членом Бюджетной Комиссии ЦИК БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

27 октября 1928 г.
г. Минск.

IX Усебеларускі зьезд с.-гаспадарчых і лясных рабочых.

ЗА ЛЕНІНСКУЮ ЛІНІЮ.

На ранішнім пасяджэньні 4-га лістапада на зьезьдзе с-г. і лясных рабочых выступіў з прамоваю Заваргадзелам ЦК КП(б)Б т. Гантман, які адзначыў вялікую ролю саюзу с-г. і лясных рабочых на вёсцы ў справе арганізацыі пралетарскіх і поўпралетарскіх элемэнтаў вёскі.

— Неабходна,—кажа прамоўца,—больш арганізацыі пралетарскіх і поўпралетарскіх элемэнтаў вёскі вакол партыі і вакол вашага саюзу.

Закранаючы пытаньне аб спэцыялістах, т. Гантман адзначае, что спэцыялісты працуюць у галіне с-г. пад кіраўніцтвам партыі, выконваюць надзвычайна адказную працу па сацыялістычным будаўніцтве.

— Мы маем ужо,—адзначае прамоўца,—вялізарнае зрушэньне сярод шырокіх мас саюзу. Ужо зараз батрак, с-г. рабочы адыгрываюць паважную ролю ў грамадзкім жыцьці вёскі. Ці можна задаволіцца тым, што мы там зараз маем? Не, ня можам.

У справе правядзеньня дырэктыў партыі на вёсцы, у справе арганізацыі пралетарскіх і поўпралетарскіх элемэнтаў і падтрыманьня высокае клясавае сьвядомасьці—ваш саюз мае надзвычайна вялікае значэньне.

У заключэньне т. Гантман заклікаў саюз с-г. і лясных рабочых прыняць актыўны ўдзел у надыходзячай кампаніі перавыбараў саветаў.

— Лёзунг партыі,—адзначыў прамоўца,—гэта, каб кожны актыўны батрак і с-г. рабочы быў у шэрагах партыі.

У ГАСЬЦЯХ У ШЭФА.

3-га лістапада зьезд с-г. і лясных рабочых быў у гасьцях у свайго шэфа № беларускага палка, дзе гасьцям наладзіці ўрачыстае спатканьне. Гасьцей знаёмілі з жыцьцём і бытам чырвонаармейцаў пачаставалі вячэрай, а пасьля ў клюбе быў арганізаваны музычна-вакальны вечар.

Зьезд падняс шэфу ў падарунак 2 жывых сьвіней, і зьезд пастанавіў вызначыць на наступны год для палка 9 месц у доме адпачынку саюзу.

На супольным пасяджэньні дэлегатаў зьезду і чырвонаармейцаў Нарком Замляробства т. Прышчэпаў зрабіў даклад аб чарговых мерапрыёмствах па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Газэце „Савецкая Беларусь".

IX Усебеларускі зьезд саюзу с.-г. і лясных рабочых БССР, які сабраўся для вырашэньня надзвычайна важных задач, што стаяць перад авангардам сацыялістычнага будаўніцтва на вёсках, з вялікім задавальненьнем адзначае тую ўвагу, якую адводзіць работе зьезду наш друк, асабліва газэта „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ". Дзякуючы гэтаму, раскіданыя па ўсіх куточках БССР вясковыя пралетары, маюць магчымасьць сачыць за работай свайго зьезду, а рабочыя гораду могуць блізкэй пазнаёміцца з умовамі жыцьця і работаю сваіх братоў па клясе.

Зьезд заклікае ўсіх батракоў, пастухоў, рабочых савгасаў, лясьнікоў, лесарубаў адзіночак, спэцыялістаў сельскай і лясной гаспадаркі і усе арганізацыі саюзу ўстанавіць цесную сувязь з газэтай „Савецкая Беларусь" і шырока распаўсюджваць яе сярод усіх працоўных.

Прэзыдыум Зьезду.
3-га лістапада 1928 г.

ХРОНІКА.

Адчыненьне Інстытуту Аховы Працы.

8 лістапада ўвечары адбылося ўрачыстае адчыненьне Беларускага Інстытуту Аховы Працы.

Адчыняючы ўрачыстае пасяджэньне, Народны Камісар Працы тав. Бэнэк зазначыў, што Інстытут Аховы Працы пачаў працаваць некалькі месяцаў таму назад. Наша гаспадарка, наша прамысловасьць з кожным годам разьвіваецца ўсё больш і больш і таму пытаньні аховы працы рабочых патрабуюць да сябе ўсё большай увагі. Дагэтуль мы займаліся саматужніцтвам: паасобныя прадпрыёмствы рабілі досьледы і, часам, праводзілі ў жыцьцё тыя ці іншыя мерапрыёмствы ў галіне тэхнікі бясьпечнасьці, у галіне аховы працы. Часам у нас ёсьць досыць добрыя вынікі ў галіне дасьледчай працы, але прадпрыёства за свае сьцены гэтыя новаўвядзеньні не выпускае, а трымае іх у сакроце.

Інстытут Аховы Працы ўсе гэтыя досьледы і новаўвядзеньні на асобных прадпрыёствах выявіць, праверыць навукова і пашырыць іх на ўсе аднолькавыя прадпрыёмствы.

Дзякуючы яшчэ слаба пастаўленай аховe працы, мы часам нясём шмат страт. Праўда, тут вінавата ня злая воля, а нашы старыя звычаі працаваць па «старинушке». Нашы адміністратары і гаспадарнікі часта не праводзяць тыя ці іншыя мерапрыёмствы па аховe працы выключна толькі таму, што не разумеюць карысьці гэтых мерапрыёмстваў ня толькі для рабочых, але і для самога прадпрыёмства.

Інстытут Аховы Працы не павінен замкнуцца ў сваіх сьценах, ён павінен знаёміць з сваёй працай, з сваімі досьледамі шырокія колы рабочых і нашых гаспадарнікаў.

Навуковая праца Інстытуту павінна быць пашырана і перанесена на прадпрыёмствы. Задачы, якія пастаўлены перад Інстытутам, ён зможа выканаць толькі тады, калі ўсе навуковыя сілы прыдуць яму на дапамогу і займуцца вывучэньнем пытаньняў аховы працы.

Бліжэйшая задача Інстытуту—вывучэньне пераходу на 7-гадзінны рабочы дзень і скарыстаньне жаночай працы на прадпрыёмствах; правільнае ўкамплектаваньне прамысловасьці рабочай сілай; арганізацыя працы і санітарна-тэхнічны дабрабыт прадпрыёмстваў.

ПРЫЕЗД РАБОЧАГА-МЭТАЛІСТА З НЯМЕЧЧЫНЫ.

Па запрашэньню рабочых заводу „Мэтоль" 6 лістапада ў Менск прыехаў прадстаўнік нямецкіх мэталістаў тав. Карл Фэрш,—рабочы сьлесар. Тав. Фэрш застанавіўся ў аднаго з рабочых заводу, які ўладае нямецкай мовай. 6 лістапада рабочыя знаёмілі т. Фэрша з сваім заводам, а ўвечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 11-й гадавіне Кастрычніка.

Тав. Фэрш пазнаёміў рабочых Менску з тым, як працуюць і жывуць рабочыя Нямеччыны; як ім прыходзіцца змагацца з капіталістамі. Думкі рабочых Нямеччыны накіраваны на СССР, і мы спадзяемся, што ўсеспольвэтны Кастрычнік ня так далёк.

Тав. Фэрш кажа, што ён вёз для сваіх менскіх братоў мэталістых сьцяг, але на граніцы польская жандармэрыя яго адабрала.

Мэталісты Менску ўмоўна прынялі сьцяг ад нямецкіх рабочых і перадалі т. Фэршу сьцяг для апошніх.

7 лістапада т. Фэрш прынаў удзел у агульнай дэманстрацыі працоўных Менску і перадаў ім прывітаньні ад рабочых Нямеччыны.

Напярэдадні Ўсебеларускага зьезду працаўнікоў асьветы.

15 лістапада адбудзецца пленум Цэнтральнага Праўленьня Саюзу працаўнікоў асьветы. 17 лістапада а 6-й гадзіне ў памяшканьні першага Белдзяржтэатру адбудзецца ўрачыстае адчыненьне 8-га Ўсебеларускага зьезду саюзу працасьветы. Пасьля ўрачыстага адчыненьня будзе пастаўлена п'еса.

Набор у лётныя школы.

15-га лістапада пачнецца набор кандыдатаў у лётныя школы вайскова-паветраных сіл. Набор будзе праводзіцца праз акруговыя саветы ТДА—Авіяхіму. Менскаму акруговаму савету ТДА—Авіяхіму прадстаўлена 45 месц. Усе жадаючыя паступіць у гэтыя школы павінны падаць заявы у Менскі акрсавет ТДА—Авіяхіму не пазьней 15-га лістапада.

Пасьля гэтага тэрміну пачне працаваць прыймовая камісія.

Паступіла 4.213.360 руб. с.-гасп. падатку.

Водлуг вестак Наркамфіну БССР да 1-га лістапада па ўсіх округах паступіла сельска-гаспадарчага падатку і нядоімкі 4.213.360 руб. Першае месца займае Мазыршчына, якая сабрала 35,4 проц. гадавой сумы, Бабруйшчына—32,4 проц. і Магілеўшчына — 31,6 проц. Адстаюць Гомельшчына і Віцебшчына.

Прыезд амэрыканскага мастака.

У Менск прыехаў амэрыканскі яўрэйскі мастак П. Гаровец. Апошні знаходзіўся 3 месяцы у яўрэйскіх калёніях Савецкага Саюзу. На працягу гэтага часу мастаком напісана каля 40 эскізаў з жыцьця калёністаў. Апрача гэтага, ім напісана 9 партрэтаў відных савецкіх дзеячоў (Калінін, Луначарскі, праф. Самойлоўч, Чухноўскі і г. д.).

Хлебазагатоўкі.

На вестках Наркамгандлю па ўсёй БССР за 20 дзён кастрычніка розных хлебапрадуктаў загатоўлена 3412 тон, што складае 40 проц. месячнага пляну. Чамольнага збору паступіла 1922 тоны. Непасрэдна ад сялянства загатоўлена 1020 тон.

Удзел МОПР'у ў перавыбарнай кампаніі саветаў.

Сёлета арганізацыі МОПР'у прымуць у першыню шырокі ўдзел у перавыбарах саветаў. Пытаньне аб удзеле МОПР'у ў перавыбарах саветаў будзе абгаварвацца на п. п. сумах акруговых і раённых камітэтаў МОПР'у і вячэек МОПР'у. На месцах арганізацыі МОПР'у павінны ўдзельнічаць у перавыбарчых сходах, садзейнічаючы правядзеньню кандыдатур з сялянскай беднаты і жанчын. Ва ўсіх хатах-чытальнях, нарадах тывістамі МОПР'у будуць праводзіцца агітаркі МОПР'у аб перавыбарах.

Пачалася зімовая кампанія дапамогі палітвязьням.

З 1-га лістапада пачалася зімовая кампанія дапамогі палітвязьням буржуазных турмаў. Кампанія працягнецца да 15-га студзеня. Месцам ужо дадзены ўказаньні аб парадку правядзеньня гэтай кампаніі.

Экскурсія бабруйскіх друкароў.

6-га лістапада ў Менск прыехала на Кастрычнікаўскія ўрачыстасьці экскурсія бабруйскіх друкароў у складзе 10 чал.

Экскурсія наведала ў дні сьвята друкарні, Музэй Рэвалюцыі БССР, Хлебазавод і інш.

8-га лістапада менскія друкары наладзілі для бабруйскіх друкароў спэцыяльны абед.

Закончыўся прызыў 1906 году.

Закончылася адпраўка прызыўнікоў Менскай акругі ў вайсковыя часьці. Апошняя адпраўка прызыўнікоў адбылася 8-га лістапада.

Прызыўнікі, якія спэзьніліся на тых ці іншых прычынах, павінны зьявіцца на камісію Менскага акрваенкамату, якая працуе на пятніцах штотыдзёва.

Новае паштова-тэлефоннае агенцтва.

Менская паштова-тэлеграфная кантора адчыніла новае паштова-тэлефоннае агенцтва на рагу Пляшчы Парыскай Камуны і Чычэрынскай вул. (дом № 11). Пры гэтым агенцтве адчынена таксама каса ашчадносьці.

Усяго зараз на Менскай акрузе існуюць 18 паштова-тэлефонных агенцтваў.

Падрыхтоўка спэцыялістаў па агнятрываламу будаўніцтву.

Згодна пастановы Нар. Кам. Асьветы БССР, у Полацку адчыняецца прафэсыянальна-тэхнічная школа на агнятрываламу будаўніцтву. Курс навучаньня ў гэтай школы—3-хгадовы.

Нар. Кам. Асьветы даручыў Полацкай Акруговай Інспэкцыі Нар. Асьветы зрабіць захады да адчыненьня гэтай школы з 15-га лістапада г. г.

Урачыстае пасяджэньне ў Бел. Ак. Навук.

6-га лістапада ў вялікай залі Беларускай Акадэміі Навук адбылося ўрачыстае пасяджэньне Акадэмічнай Рады, прысьвечанае 11-цігодзьдзю Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Прэзыдэнт БАН т. Ігнатоўскі зрабіў даклад на тэму: «Кастрычнікавая рэвалюцыя і беларуская культура», т. А. Цьвікевіч—«Кастрычнікавая рэвалюцыя ў асьвятленьні гісторыі Беларусі».

Урачыстае адчыненьне Одонтолёгічнага Інстытуту.

7-га лістапада адбылося ўрачыстае адчыненьне Одонтолёгічнага Інстытуту Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР.

На ўрачыстым адчыненьні прысутнічалі Нар. Кам. Аховы Здароўя тав. Барсукоў, рэктар унівэрсытэту праф. Пічэта, дэкан мэдфаку праф. Кроль, шмат прафэсароў, дактароў і студэнтаў, а таксама прадстаўнікі Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу. Апрача гэтага, на ўрачыстым адчыненьні прысутнічаў спэцыяльна прыехаўшы з Масквы, дырэктар Дзяржаўнага Інстытуту Забясьпечаньня і загадчык Одонтолёгічнай сэкцыі НКЗ РСФСР прафэсар П. Г. Дауге. Одонтолёгічны Інстытут рэарганізаваны з зубной паліклінікі Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу. Інстытуту дадзена назва «Імя ЦК Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу».

Менскі дзень.

— Акруговая канфэрэнцыя беднаты скліканая 25-га лістапада. На канфэрэнцыі будуць заслуханы даклады аб задачах гаспадарчага будаўніцтва і аб перавыбарах саветаў.

— Вячэрнія дзяжурэты сяброў праўленьня Менскага цырабпому пастанавілі ўвесьці праўленьне МЦРК. Дзяжурэты будуць адбывацца па панядзелках і сэрадах.

— Акруговая канфэрэнцыя загадчыкаў дзіцячых дамоў і камун скліканая 17-га лістапада ў Менску. На канфэрэнцыі будзе абгаворан шэраг пытаньняў, зьвязаных з далейшай працой дзіцячых дамоў і камун.

— Акруговая канфэрэнцыя „Азэт" скліканая на 10-га лістапада ў Менску. На канфэрэнцыі будуць заслуханы даклады аб працы Менскага і Беларускага «Азэту». У працы канфэрэнцыі прымуць удзел прадстаўнікі яўрэйскіх калгасаў Менскай акругі.

— Белсельтрэст ужо адправіў у Аўстрыю і Нямеччыну 40 вагонаў яблык і груш беларускіх саўгасных гаспадарак.

Маецца на ўвазе адправіць за межы яшчэ 20 вагонаў яблык.

Па атрыманых вестках, беларускія „антонаўкі" карыстаюцца на замежных рынках вялікім посьпехам.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Расьліны маўчыма штучна дасьпяліць.

Даўно вядома, што хлараформ, эфір і інш. змушаюць расьліны больш энэргічна расьці.

Амэрыканскі прафэсар Гарвей пасьля доўгіх досьледаў даказаў, што газ этылен робіць найвялікшы ўплыў на расьліну і ў той жа час ён найбольш выгодны дзеля практычнага ўжываньня. Плоды, пасьпеўшыя ўсяго на тры чвэрткі, пад уплывам этылену дасьпявалі за адзін дзень.

Працэс штучнага дасьпеліваньня зусім просты і танны. Напрыклад, каб дасьпяліць адзін пук гароднины, трэба затраціць этылену прыблізна на 5 капеек. Этылен здабываецца ад сухога перагону каменнага вугля, дрэва і тлустасьцяў.

Вынаходка праф. Гарвея мае аграмадзнае практычнае значэньне ў сельскай гаспадарцы.

Найлепшае радыё-абсталяваньне ў акіяне.

Нядаўна закончана радыё-абсталяваньне курсіруючага паміж Каліфорніяй і Гавайскімі выспамі амэрыканскага параходу „Малодо". Гэты параход можа падтрымліваць сувязь на звычайнай для гандлёвых суднаў хвалі ў 600 мэтраў, а таксама на хвалі ў 1850 і 1250 мэтраў.

На яго палубе ёсьць тэлефонная будка, з якой пасажыр можа гутарыць па радыётэлефону з іншымі суднамі ў моры, а таксама і з берагам.

У кожнай каюце ёсьць радыёўстаноўкі як дзеля перамаўленьняў, так і дзеля атрыманьня ў поўнай гадзіны тэлеграм і інфармацыі са ўсіх канцоў сьвету. Параход мае тры антэны, з якіх адна взучана з цэнтральным прыймнікам і гучнагаварыцелем, якія перадаюць у салён канцэрты з радыёвяшчальных станцый.

Машына дзеля пракладкі кабеля.

Да апошняга часу земляныя работы па пракладцы электрычных і тэлефонных ліній пад зямлёй вяліся надта марудна і каштавалі дорага. Шмат часу траціла рыцьцё равоў ручным спосабам.

Зараз у Нямеччыне зроблена такая машына, пры дапамозе якой усе работы па пракладцы кабеляў адбываюцца аўтаматычна. Дзеля абслугоўваньня такой машыны патрэбна ўсяго пяць чалавек.

Гэтай машынай можна пракласьці ад 60 да 90 мэтраў кабеля ў гадзіну. Пракладка аднаго мэтра кабеля мэханічным спосабам каштуе ў 6 разоў таньней за пракладку ручным спосабам.

Новая зямля.

Аўстрыйскі вучоны Дуглас Маусон, яш два гады таму назад знайшоў у Паўднёвым ледавітым акіяне некалькі новых выспаў, апублікаваў даклад, у якім даказвае аб існаваньні каля Паўднёвага канцавосьсяў новага заселенага мацярыка. Гэта „новая зямля" на сваёй плошчы прыблізна ў два разы большая за ўсю Паўночную Амэрыку.

Маусон пераканаўся ў існаваньні гэтага мацярыка ў часе свайго апошняга падарожжа на канцавосьсе. Зараз Маусон заняты арганізацыяй новай экспэдыцыі дзеля вывучэньня гэтай яшчэ невядомай навукі зямлі.

Экспэдыцыя адправіцца ў дарогу ў канцы 1928 або ў пачатку 1929 году. Маусон мяркуе ўзяць з сабой некалькі самалётаў.

Капіраваньне кінематаграфскім спосабам.

У Амэрыцы кіно знайшло новае прыстасаваньне—капіраваньне рэдкіх пісаных і друкаваных матар'ялаў, якія захоўваюцца ў музэях і бібліятэках і існуюць часам усяго ў некалькіх экзэмплярах на ўсім сьвеце.

Спосаб здымкі як кніг, так і рукапісаў аднолькавы. Дзеля здымкі кніг трэба здымаць кожную старонку асобна. Мэтр кінастужкі вымяшчае звыш 50 малюнкаў, а таму дзеля здымкі тома ў тысяч старонак патрэбна ня больш 20 мэтраў стужкі.

Здымка кніг ужо практыкавалася ў Злучаных Штатах.

Ліст у рэдакцыю.

Шаноўны тав. рэдактар!

Неадмоўнеся вымясьціць на старонках газ. «Савецкая Беларусь» наступнае:

Гэтымі днямі вышла з друку чацьвертае выданьне чытанкі «Чырвоная Беларусь» уложанай І. Мазурам і К. Шапялевічам, у якой прыведзены мне нарыс аб Кастусі Каліноўскім «1863 год на Беларусі», які фактычна належыць Андр. Александровічу, вяўляючыся ўрыўкам з яго „Палёту ў мінулае" (Маладняк № 5—1924 г.).

У гэтай-жа чытанцы вымешчана ў скарочаным выглядзе апавяданьне (Юзік з таго сьвету") пад назвай „Куцаньне", прычым адзначана, што яно належыць Уладзіміру Барашку, у той час, калі вяўляецца маім.

З пашанай Клары Барашка.

Апавяшчэньні.

— У суботу, 17 лістапада, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Карла Маркса адчыняецца партыйная канфэрэнцыя рэарганізаванага Кастрычнікаўскага раёну.

Выбары на канфэрэнцыю правесьці па модулю адзін дэлегат з рашаючым голасам ад 5 запраўдных сяброў партыі і адзін дэлегат ад 15 кандыдатаў з дарадчым голасам.

Выдача мандатаў будзе адбывацца ў памяшканьні Ляхаўскага РК КПБ з 14 лістапада ад 6 да 9 гадзін увечары, а ў дзень канфэрэнцыі да 3-х гадзін дня.

Сэкратар Менскага А'К КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

— У суботу, 10-XI г. г., а 8-й гадзіне увеч., у памяшканьні АК МОПР'у (Савецкая 87, другі паверх) адбудзецца першыя заняткі курсаў МОПР-акцыяў.

Просьба да ўсіх т. т., запісаўшыхся на курсы, зьявіцца своечасова.

У НАВУКОВЫМ Т-ВЕ.

У нядзелю, 11 лістапада, а 5 г. веч. у фіз. аудыт. БДУ адбудзецца сход фіз.-матэм. сэкцыі, на якім выступіць з дакладамі:

1) Дац. Дыдырка—аб замежнай камандыроўцы.

2) Дац. Усьяренскі і Сьнятко—аб VI Усес. зьезьдзе фізікаў.

— У нядзелю, 11 лістапада, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні пэдфаку адбудзецца пасяджэньне літаратурнае сэкцыі наз. т-ва пры БДУ.

На павестцы даклад праф. Вазьнясенскага: „Беларускі Дзяржаўны Тэатр 2".

Клюб навуковых працаўнікоў.

У нядзелю 11 лістапада а 12-й гадзіне дня, сход усіх запісаўшыхся і жадаючых працаваць у гуртках на вывучэньню французкай мовы, дзеля разьмеркаваньня на групы.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі:

1. «Паляўнічы Беларусі» за верасень-кастрычнік м-цы г. г. Выданьне і органа Беларускага Прамыслова-Каапэрацыйнага Саюзу Паляўнічых. Менск. Стар. 38, цана 30 кап.

2. «Маладняк» № 9. Штомесячная літаратурна-мастацкая, грамадска-палітычная часопісь. Стар. 112, цана 60 кап.

Выданьне ЦК ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена» Менск.

3. „Плуг" № 7-8, стар. 79, цана 60 кап. Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны.

Паштовая скрынка.

М. Альбіцкому. Вашы запіскі «Па Дняпру і Крыму» друкавацца ня будуць. Апрача немагчымага для газэты памеру іх, яны зроблены даволі бессыстэмна і з дробных уражаньняў пяхка вылучыць агульнацікавыя моманты. Стыль і мова таксама кульгаюць.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

Субота 10 — Саюзу Савгандльслужачых „БРОНЕЦЯГНІК" Білеты праз рабочую касу. ПАЧАТАК А 8 ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Падвойная праграма. 2 ФІЛЬМЫ ЗА АДЗІН ВЕЧАР 1. „Сьветлы горад"—у 6 частк. 2. „Леў і зоркі"—у 2 частк.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Ад аўторка 6 лістапада ПАДКОВА ШЧАСЬЦЯ камэдыя ў 6 частках. Кіно-хроніка СОВКІНО. Звыш праграмы: гастролі вядомых сучасных сатырыкаў РОБ І ГУД. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад аўторка, 6 лістапада „ДЗЯЎЧЫНА З ДАЛЁКАЙ РАКІ". Кіно-паэма ў 7 частках. Звыш праграмы—Кіно-хроніка. Пачатак 1 с. а 7 г.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР" „МАСКВА Ў КАСТРЫЧНІКУ". у 6 частках. Пачатак сэансаў а 3 з пал. гадз. дню. Каса адчын. ад 2½ г.

Праўленьне Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Сельскае Гаспадаркі імя КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ абвяшчае КОНКУРС на замяшчэньне асыстэнцкіх пасад па катэдрах:
1) Эканомікі земляўпарадкаваньня,
2) Арганізацыі земляўпарадкаваньня.
Пэнсія—170 руб. у месяц. Аплата расходаў па пераезду па фактычнай каштоўнасьці, але ня звыш месячнай пэнсіі.
Заявы і патрабныя дакуманты накіроўваць да 1-га сьнежня б. г. у С.-Г. Акадэмію, Горы-Горкі, БССР.

Адчыненьне міжсаюзнай канфэрэнцыі саюзаў Паперніка, Друкароў, Тэкстыльшчыкаў, Шэвэйнікаў, Водвікаў, Транспарт, Парсувязі, Працмастацтва і РКХ адбудзецца сёньня а 6-й гадз. увечары ў памяшканьні саюзу с-г. і лясных рабочых (Дом Працы, 2-гі паверх, пакой № 13).
ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАМУНІСТЫЧНАГА ЎНІВЭРСЫТЭТУ ІМЯ У. ЛЕНІНА, ВОБЧАСТВА МАРКСІСТАЎ, ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ І НАВУКОВАЕ ТАВАРЫСТВА ПРЫ БДУ АРГАНІЗУЮЦЬ 10 ЛІСТАПАДА Г. Г. а 7 в пал. гадз. увечары ў актавай залі БДУ (Земляробскі пав. № 4) УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ, ПРЫСЬВЕЧАНАЕ 60-ГОДЗЬДЗЮ З ДНЮ НАРАДЖЭНЬНЯ М. Н. ПАКРОЎСКАГА. З дакладамі выступяць: Рэктар Ун-ту праф. У. Пічэта, праф. Нікольскі, дацэнты: Рыўлін, Югаў і Пучкоў. Уваход вольны.
Праўленьне БДУ.

У чацьвер, 15-га лістапада, У БЕЛАРУСКІМ ПЕРШЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ адбудзецца КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭНЬНЕ ВАКАНСІЙ СУПРАЦОЎНІКАЎ-ПРАКТЫКАНТАЎ У СКЛАД АРТЫСТАЎ БДТ1. Пачатак а 1-й гадз. удзень.

Лічыць несапраўднымі пасьведчаньні за № 1265 і 1266 на імя КІСЕЛЯ А. А., выдадзеныя Беларускай канторай „САЮЗХЛЕБ".

Народны суд 4 вучастку, Менскай акругі (яўрэйская нацкамэра), на падставе 204-205 артыкулаў ГПК БССР прапануе гр-ну ШМУЦУ ПІНХУСУ ЛЕЙБАВУ 48 год, які служыў у Казанскім Цэрабкопе з 16 IX-25 г. да 11-XII-26 г. (апошні адрас Шмуца Казань, Вялікаказанскае вул., дом 20), затым выехаў 27 г. паехаў лячыцца ў Сухум, зьявіцца ў суд альбо паведаміць аб сваім месцажыхарстве.

Адначасова суд зварочваецца да ўсіх асоб і ўстаноў, якім вядома аб месцы жыхарства, ці аб сьмерці гр-на Шмуца, паведаміць аб гэтым суд—МЕНСК, СЬВЯРДЛОЎСКАЯ ВУЛ. д. № 2.

Бярозаўскі сельсавет Глускага р-ну паведамляе, што гр-н в. Падлужжа «БАСЯК» Ф. А. зьмяняе прозьвішча «БАСЯК» на «БЯЛІНСКІ». Асобы, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць аб гэтым у Бярозаўскі с-савет.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Мэтрычн. выпісь Гаравой І. М.
— Часовае пасьведчаньне Ватмана А. Я., выд. Мазырск. ЦРК.
— Мэтрычн. выпісь Палей І. Ш.
— Часовае пасьведчаньне Клугермана О. П., выд. Мазырск. ЦРК.
— Мэтрычн. выпісь Вікенцьева К. Ф.
— Мэтрычн. выпісь Гэйфмана Э. А.
— Часовае пасьведчаньне Сандамірскага З. К., выд. Мазырск ЦРК.
— Каапэрац. кніжка Кафмана Б. Г., выд. Мазырскім ЦРК, 2) Сяброўскі білет саюза працасьветы і камсамольскі білет.
— Лекцыя кніжка Ламакіной А. І.
— Назвая кніжка с.-гасп. т-ва Крылова Г. А.
— Асабовае пасьведчаньне № 94, выд. Лепельскім РВК, 2) вучотна-асабовая карт. № 333, выд. 15 асоб. батар. на імя Грахольскага Г. І.
— Камсамольскі білет 49167 Валчука П. М., выд. Полацкім Акр. Кам. ЛКСМ і сяброўск. кніжка № 29378, выд. Полац. Акр. Адз. саюзу С.-Г. Л. і З.
— Сяброўск. заборная кніжка № 1624 Тухто А., выд. Лепельскім спаж. т-вам.
— Пасьведчаньне аб вызваленьні ад вайсковай павінасьці Аношка П. В., выд. Чэрвінскай прызыўн. камісіі.
— Асабовае пасьведчаньне Арлова А. В., выд. Лепельскім РВК.
— Сяброўск. заборная кніжка № 476, Эльківда І. Д., выд. Лепельск. спаж. т-вам.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Мазырскага акруговага Аптэкакіраўніцтва

на 1-е кастрычніка 1927 году.

АКТЫЎ

№№ чарг.	НАЗВА РАХУНКАЎ.	Сума. Прыватная. Руб.	К.	Агульная. Руб.	К.
1.	Грашовыя сродкі				
	а) Каса	445	55	—	—
	б) Бягуч. рахун. у Мазыр. А-ве Дзярж Банку	85	94	—	—
	в) Пай у Маз. Т-ве Усасмнага Крэдыту	150	—	—	—
	г) Каштоўн. паперы	80	—	761	49
2.	Маемасьць	—	—	9910	14
3.	Тавары				
	а) На складзе ў аптэках	43846	77	—	—
	б) У дарозе	7840	87	51687	64
4.	Дэбіторы				
	а) Падсправаздачныя сумы	131	55	—	—
	б) Розныя асобы і ўстановы	2233	51	—	—
	в) Выдаткі б. пэрыяду	203	—	—	—
	г) Акрэдраў	81	46	—	—
	д) Рабочыя і служачыя	578	65	3228	17
	БАЛЯНС	—	—	65587	44

ПАСЫЎ.

№№ чарг.	НАЗВА РАХУНКАЎ.	Сума. Прыватная. Руб.	К.	Агульная. Руб.	К.
	Капітал:				
1.	а) Асноўны	9910	14	—	—
	б) Запасны	524	93	—	—
	в) Зваротны	9321	09	19756	13
2.	Вэксалі да плацяжу	—	—	24893	50
3.	Крэдыторы:				
	а) Розныя асобы і ўстановы	6911	70	—	—
	б) Падсправаздачныя сумы	1	13	—	—
	в) Інспэктура Акруговага Аддзелу Аховы Здароўя	309	27	7222	10
4.	Фонды:				
	а) Амартызацыйны	586	62	—	—
	б) Па палепшэньню быту рабочых і служ.	172	47	—	—
	в) Па палепш. лячэбна-санітарн. устаноў	1102	42	—	—
	г) На палепш. гаспад. абсяд. у сельскіх мясцовасьцях	734	95	2606	46
	Вынікі:				
	Прыбытак за 1926-27 год	—	—	11109	20
	БАЛЯНС	—	—	65587	44

Загадчык Мазырскага акруговага Аптэкакіраўніцтва РУБІНШТЭЙН.
Бухгальтар ТУРЭЦКІ.

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

Мазырскага Аптэкакіраўніцтва за час з I-X-1926 г. па I-X-1927 г.

ДЭБЕТ.

ЗЬМЕСТ ЗАПІСУ.	Сума Руб.	К.
Выдаткі з 1-X-26 г.—1-X-27 г.		
Мазыр. Цэнтр. аптэка	28501	74
Магазын санітарыі і гігіены	3982	66
Калінкавіцкая аптэка	4391	04
Парахільнская »	1947	82
Капаткевіцкая »	2137	63
Тураўская »	2895	53
Жытк